незалежная газета

№ 20 (665) 26 мая 2010

www.nn.by

# Наша Ніва

П Е Р Ш А Я   Б Е Л А Р У С К А Я   Г А З Е Т А

Заснаваная ў лістападзе 1906. Аднэўленая ў маі 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у серады

**Топ-10 беларусаў-эмігрантаў у Расіі**

Старонка 9



**Хто валодае беларускімі гіпермаркетамі?**

Старонка 4




**Юры Туронак: І «Пагоня» вернецца, і мова таксама...**

Старонка 12



### У НУМАРЫ

**Звесткі пра візіт Макея ў ЗША аказаліся заўчаснымі**

Візіт Макея адкладзены, а вось прыезд лідэра апазіцыі Аляксандра Мілінкевіча адбыўся згодна з графікам. **Старонка 2.**

**План Б: без Лукашэнкі**

Мядзведзеў і Назарбаеў хочуць абысціся без беларускага кіраўніка. **Старонка 7.**

Я іду праз Дразды — правяраю пасты. Ящчэ спяць і халопы, і Коля... **Старонка 2.**

**Сто фанатаў біліся ў Слуцку**

19 мая ў Слуцку каля парка адбылася амаль Грунвальдская бітва. **Старонка 6.**

**Блокбастэр-мокбастэр**

На экраны выйдзе «Тытанік: Працяг». Ды Капрыё і Кейт Уінслет зноў разам? О не: гутарка вядзецца пра «мокбастэр». **Старонка 11.**

**Навука Таргавіцы**

Уладзімір Някляеў рытарычна запытаўся, «чаму кепска гаварыць праўду за расійскія грошы». Беларуская гісторыя мае адказ на гэтае пытанне. Піша Сяргей Богдан. **Старонка 9.**

«Наша Ніва» з'яўляецца ў кіёсках у Мінску ў сераду ад абеду, у рэгіёнах — у чацвер. На газету можна і падпісацца — глядзі **старонку 2**.




# З праўды гаворка збілася на расійскія грошы

«Скажыце, навошта Маскве падтрымліваць беларускага паэта?» — кажа сам Уладзімір Някляеў. **Старонка 8.**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

## Кадравае ўмацаванне перад выбарамі

Сямён Шапіра стаў кіраўніком Гродзенскай вобласці, а Барыс Батура — Мінскай.

### Аграрны статус Гродзеншчыны

Ад студзеня пуставала пасада старшыні Гродзенскага аблвыканкама, якую пакінуў Уладзімір Саўчанка. Выканальнікам абавязкаў тады стаў Іван Жук, але пазбавіцца прыстаўкі в.а. яму так і не далі.

Новым кіраўніком Гродзеншчыны прызначаны міністр сельскай гаспадаркі Сямён Шапіра. Яму 49, родам з Любанскага раёна. Скончыў наргас. Доктар эканамічных навук.

У свой час Шапіра ўзначальваў адну з найбольш паспяховых гаспадарак краіны — агракамбінат «Дзяржынскі». Міністрам сельскай гаспадаркі стаў у красавіку 2008 года, змяніўшы Леаніда Русака. Цікава, што ў 1990-х Шапіра ўваходзіў у кіроўныя органы Аб'яднанай грамадзянскай партыі.

Прызначэнне міністра сельскай гаспадаркі можа сведчыць пра тое, што Гродзеншчына па-ранейшаму ўспрымаецца лукашэнкаўцамі як рэгіён аграрны. Раней «губернатарам» у Гродне быў аграрнік Аляксандр Дубко.

### Перадвыбарная экзекуцыя Саўчанкі

У суботу прадстаўляць новага кіраўніка аблвыканкама ў Гродна прыехаў Аляксандр Лукашэнка. Сярод іншага ён патлумачыў і прычыну адстаўкі Уладзіміра Саўчанкі.

Лукашэнка зазначыў, што за час кіравання Саўчанкі вобласць «так і не змагла рэалізаваць свой патэнцыял». «У немалой ступені руху наперад перашкаджала і тое, што замест мабілізацыі людзей на ліквідацыю недахопаў Уладзімір Саўчанка вельмі балюча рэагаваў на крытыку (не ад прэзідэнта, іншых), выжываў непажаданых яму кіраўнікоў. Але самае галоўнае — страціў пачуццё адказнасці за даручаны ўчастак працы», — заявіў Лукашэнка.

Што мелася на ўвазе пад «пачуццём адказнасці»? Магчыма, тое, што Гродзенская вобласць за апошні час выйшла на першае месца па карупцыі сярод высокіх чыноўнікаў.

Крымінальныя справы заведзеныя на былога кіраўніка Гродзенскай абласной міліцыі Генадзя Хацько (ён абвешчаны ў вышук, але так і не знойдзены), старшыні Гродзенскага аблсавета Аркадзя Карпуця.

**Працяг на старонцы 3.**

# Звесткі пра візіт Макея ў ЗША аказаліся заўчаснымі

**Візіт Макея адкладзены, а вось прыезд лідэра апазіцыі Аляксандра Мілінкевіча адбыўся згодна з графікам.**

Выглядае, што звесткі аб візіце Макея ў Вашынгтон, што з'явіліся на мінулым тыдні на сайце Аб'яднанай грамадзянскай партыі, аказаліся заўчаснымі. Паводле інфармацыі «НН» з амерыканскіх крыніц, візіт планаваўся, але ўжо двойчы адмяняўся.

У аўторак Міністэрства фінансаў ЗША чарговы раз працягнула рашэнне аб змякчэнні санкцый у дачыненні да двух беларускіх прадпрыемстваў канцэрна «Белнафтахім» — ААТ «Лакафарба» і «Полацк-Шкловалакно». Як паведамляе афіцыйны сайт Мінфіна, дзеянне санкцый прыпыненае да 30 лістапада 2010 года. Ва ўказаны перыяд амерыканскім грамадзянам дазволенае супрацоўніцтва з гэтымі беларускімі прадпрыемствамі.

У той жа час уласнасць гэтых прадпрыемстваў на тэрыторыі ЗША застаецца заблакаванай.

Усе астатнія санкцыі ЗША, уведзеныя ў дачыненні да канцэрна «Белнафтахім» і прадпрыемстваў, якія ў яго ўваходзяць, застаюцца ў сіле.

Адмену візіту суразмоўца «НН» у Вашынгтоне звязвае з тым, што Злучаныя Штаты дагэтуль адмаўляюцца зняць эканамічныя санкцыі супраць «Белнафтахіма». У Дзярждэпартаменце меркавалі «выслухаць» Макея, а не «весці перамовы» з ім. Гэта не магло задаволіць беларускі бок.

Візіт Макея адкладзены, а вось прыезд лідэра апазіцыі Аляксандра Мілінкевіча адбыўся згодна з графікам. Ён мае сустрэчы ва ўсіх установах, што займаюцца беларускім пытаннем, а таксама шэраг знакавых сустрэч з вядомымі асобамі. Напрыклад, ён гутарыў з экс-кандыдатам у прэзідэнты ЗША Джонам Макейнам, які належыць да кола сенатараў, што вызначаюць замежную палітыку Штатаў.

**У Дзярждэпартаменце меркавалі «выслухаць» Макея, а не «весці перамовы» з ім.**

У заяве пасольства ЗША з нагоды працягнення рэжыму санкцый гаворыцца, што «нядаўнія падзеі, у ліку якіх рэйды супраць няўрадавых арганізацый («Гавары праўду») на тым тыдні, сведчаць пра тое, што дзеянні беларускіх улад у дачыненні да асноўных свабод па-ранейшаму носяць негатыўны характар». А паляпшэнне беларуска-амерыканскіх стасункаў магчымае толькі пры ўмове «рэальнага прагрэсу ў сферы дэмакратыі і захавання асноўных правоў чалавека».

Амерыканцы ўвялі такія санкцыі ў сакавіку 2008 года, калі беларуская ўлада адмаўлялася вызваліць з турмы экс-кандыдата на пасаду прэзідэнта Аляксандра Казуліна. Тады ж і пачаўся дыпламатычны скандал. У выніку паслы былі адкліканыя як з Мінска, так і з Вашынгтона.

Да сёння пасольствы працуюць у мінімальным складзе. Змякчылі санкцыі, дарэчы, акурат пасля вызвалення Казуліна і іншых палітвязняў.

«Мы ўважаем, што галоўная задача двухбаковых адносінаў — гэта дэмантаж старых завалаў і выхад на новы ўзровень кантактаў. А ключавым момантам тут з'яўляецца поўная адмена санкцый», — выказаў афіцыйнае меркаванне прэс-сакратар МЗС Андрэй Савіных. Тым не менш, крок амерыканцаў быў названы станоўчым.

**Зміцер Панкавец**

# Баян, каса і карова

**Чаму Лукашэнка кажа, што гадуе карову? Гэта элементы піяру, якія дадаюць палітыку галасоў.**



«У мяне карова ёсць. Гэта для душы. Таму што зямля ўвогуле робіць высакародным чалавека, а жывёла — тым больш... Вельмі правільна хтосьці заўважыў, што гэта і выхаванне. Калі дзіця з дзяцінства круціцца там, дзе ёсць скаціна, – гэта зусім іншы чалавек. Карова ў маім жыцці (ды і многіх вашых) — гэта душа сям'і. Яна карміла ўсіх. Мы людзі такія...».

Сваімі выказваннямі пра карову Лукашэнка паказвае, што ён такі самы, як многія іншыя грамадзяне краіны. Хоць стаў прэзідэнтам, а пра карані не забываецца. Гэта элементы піяру, якія дадаюць палітыку галасоў.

Прэзідэнт ЗША Барак Абама, напрыклад, гуляе ў баскетбол. Баскетбол у Амерыцы — гульня масавая і народная. Таксама Абама слухае джаз.

А вось яго папярэднік Джордж Буш-малодшы прапагандаваў вобраз простага хлопца з ранча. Дзе ён мог паганяць на джыпе, агледзець палеткі ці проста грызці сушкі на канапе падчас прагляду тэлевізара.

Прэм'ер-міністр Расіі Уладзімір Пуцін лепіць з сябе вобраз сапраўднага мужыка. Чаго толькі вартая ягоная славутая фотасесія з аголеным торсам падчас рыбалкі. Не сумняюцца... Не сумня — Не супраць ён і пастраляць з пісталета. А зусім нядаўна на Зямлі Франца-Іосіфа Пуцін уласнаручна адзеў ашыйнік з датчыкам на белага мядзведзя.

Вобраз Мядзведзева больш разлічаны на моладзь. Мядзведзева паказваюць як актыўнага карыстальніка сацыяльных сетак у інтэрнэце, а таксама слухача рок-музыкі.

Былая кіраўніца ўкраінскага ўраду Юлія Цімашэнка носіць касу. А прэм'ер-міністр Італіі Сільвіё Берлусконі як сапраўдны італьянец увесь час інспіруе плёткі пра свае адносіны з жанчынамі.

Ва ўсіх палітыкаў ёсць такая фішка. У Лукашэнкі такімі сталі баян, каса і карова.

**ЗП**

### «ЗАСТАНЕЦЦА НАМ З КОЛЕМ КАРОВА» – МАНАЛОГ РЭЗІДЭНТА ДРАЗДОЎ

Я іду праз ДраздЫ — правяраю пасты.
Яшчэ спяць і халопы, і Коля.
Не ўцярплю, як хлапчук, забягу у хляўчук:
Што за раніца без сырадою!

Каб стабільнасць была, каб свірэпка расла,
Каб жыла і квітнела краіна,
На ўвесь свой апарат я накінуў загад:
Гадаваць на падворку скаціну!

У Сідорскага ўчора калоў кабана
(У Сямашкі балон пазычалі).
Зваўся гэны кабан — Антыкрызісны План,
Хоць па сале рэалізавалі.

Год выседжваў Макей для Еўропы курэй,
Толькі выседзеў дэкаратыўных.
А Наташа Пяткевіч вырошчвае змей
Для айчыннай патрэб медыцыны.

Ліда у ЦВК дрэсіруе шпака,
Каб цягаў ёй са скрыні паперкі.
Ломаць, кажуць, гадуе дзіка ў КДК
І для страху бярэ на праверкі.

Пракаповіч у банку завёў хамяка.
Што ён толькі за шчокі піхае?
Зайцаў у Камітэце трымае ваўка —
Той сабак Куляшова ганяе.

Я дабрэю душой ля каровы сваёй...
Што б ні звягалі Дзіма і Вова,
Забяруць Белтрансгаз, і «Белшыну», і МАЗ —
Застанецца нам з Колем карова!

**Сяргей Мікулевіч**

### Самае чытанае на nn.by за 19—25 мая

- Як правільна распазнаць голую тэрарыстку + фота
- Някляеў: Чаму гаварыць праўду за расійскія грошы кепска?
- Аўто кандыдатаў
- Хто валодае беларускімі гіпермаркетамі?
- Някляеў, Дзмітрыеў і Вазняк на волі
- Масавая бойка ў Слуцку
- «Застанецца нам з Колем карова» — маналог рэзідэнта Драздоў
- Лукашэнка пасля працы даглядае карову
- Юры Туронак: І «Пагоня» вернецца, і мова таксама...
- Гэта трэба чуць: расійскі гімн як какафонія

### nn@nn.by

Разумныя ў казіно не пойдуць. А дурням так і трэба.

**ЛІ і ТІ**

### Сціcла

• **Толькі кожны трэці студэнт ВНУ будзе вучыцца на бюджэце.** Сёлета плануецца прыняць 200 тысяч абітурыентаў у ВНУ, ССНУ і ПТВ. Палова з іх, амаль 103 тысячы, — у вышэйшыя навучальныя ўстановы. Набор павялічыўся на 5 тысяч чалавек у параўнанні з леташнім. Мінадукацыі разлічвае на павелічэнне колькасці замежных студэнтаў, а таксама на жаданне беларусаў атрымліваць другую і трэцюю вышэйшыя адукацыі. Толькі кожны трэці студэнт ВНУ будзе навучацца на бюджэтным месцы. Астатнім давядзецца плаціць. Колькасць бюджэтных месцаў сёлета павялічаная на 854. Прычына гэтага — запатрабаванасць спецыялістаў па такіх профілях, як «тэхніка і тэхналогія», «архітэктура», на энергетычных спецыяльнасцях.

• **Чальцамі Аб'яднання «Белая Русь» з'яўляюцца 38% дэпутатаў аблсаветаў.** Пра гэта паведаміў намеснік старшыні арганізацыі, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Аляксандр Шацько.

• **Мінгарвыканкам зацвердзіў тарыфы на паркоўку транспартных сродкаў.** Паркоўка да 20 хвілін абыдзецца ў 1 тыс. рублёў, ад 21 хвіліны да 1 гадзіны і за кожную наступную гадзіну паркоўкі — 2 тыс. Перыяд бясплатнага паркавання скончаецца.

• **Кляшчы і мошкі выйшлі на паляванне.** У раёне Белавежскай і Ружанскай пушчаў зарэгістраваныя найбольшыя ачагі «заразнага» кляшча. Ды падхапіць інфекцыю можна не толькі ў векавым лесе, але і ў гарадскім парку, на лецішчы. Калі насякомае знойдзена на целе, неабходна яго выдаліць, месца ўкусу апрацаваць ёдам, а кляшча прынесці ў лабараторыю. Даследаванні платныя, але здароўе даражэйшае.

• **Крадзеж з манастырскага сейфа.** У Доме паломнікаў Свята-Елісавецінскага манастыра ў Цнянцы пад Мінскам выкрадзеная буйная сума грошай. Пра крадзеж у міліцыю заявіла манашка 24 мая, а само злачынства было ўчыненае вечарам 21 мая. Невядомы падабраў ключ і выкраў 20 млн. рублёў, 1 тыс. даляраў, 1920 еўра.

• **«Портэр» «Аліварыі» атрымаў золата.** Гатункі піва найстарэйшай мінскай піваварні былі адзначаныя прэстыжнымі міжнароднымі ўзнагародамі. На штогадовым конкурсе Superior Taste Award (Брусэль) гатунак «Аліварыя Экстра» атрымаў дзве зоркі — катэгорыя «цудоўны смак». Дэбютанту конкурсу «Аліварыя Портэр» не хапіла аднаго бала, каб атрымаць найвышэйшую ўзнагароду «выбітны смак». У выніку «Портэр» атрымаў таксама дзве зоркі.

**СП, КМ, БелаПАН**


# Не ўсё ў жыцці апошні раз

## Падпіска праз Рэдакцыю

Цана падпіскі праз Рэдакцыю на месяц складае 7500 рублёў.

Мы рэкамендуем падпісвацца праз Рэдакцыю.

Наша сістэма дастаўкі газеты за 3 гады даказала сваю надзейнасць. Мы зможам дастаўляць Вам газету хутчэй або з той жа хуткасцю, што «Белпошта».

Каб штотыдзень атрымліваць газету, дасылайце адрасы і грошы за газету.

1) Просім усіх ахвотных падпісацца паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз: тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Мінск, а/с 537.

2) Просім у бланку банкаўскага паведамлення ці паштовага перакузу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езда.

**Банкаўскія рэквізіты (змяніліся з 1 мая):**

ПВУП «Суродзічы», УНП 190 786 828

Аддз. № 539 ААТ «Белінвестбанк», вул. Калектарная, 11, Мінск, код 739

Рахунак атрымальніка: 3012 740 628 011

Від аплаты: За газету «Наша Ніва»

## Падпіска праз «Белпошту»

Цана гэтай падпіскі — 8 520 руб. на месяц.

Падпісныя індэксы ў каталогу «Белпошты»: для людзей — 63125, для прадпрыемстваў — 631252. Падпісацца можна на кожнай пошце.

## Дзякуй падпісчыкам,

якія падпісваюцца праз Рэдакцыю

А.П. з Жлобінскага раёна.
Вользе П. з Бабруйскага раёна.
В.К. з Смалявіцкага раёна.
Адзе Р. з Шаркаўшчынскага раёна.
В.Я. з Полацка.
Міхаілу Т. з Слуцкага раёна.
Віталю П. з Бераставіцкага раёна.
Уладзіміру М. з Брэста.
В.В., Галіне Л. з Гродна.

Працяг са старонкі 1.

За краты трапілі яшчэ некаторыя чыноўнікі.

Няма ніякай пэўнасці і наконт лёсу самога Саўчанкі. Па апошніх размовах, экс-губернатар цяпер знаходзіцца пад хатнім арыштам, чакаючы зняволення ці новага прызначэння.

Лукашэнка адпусціў шпільку і на адрас Саўчанкавага сына.

### Сялом будзе кіраваць чалавек, які здзекаваўся з вяскоўцаў

Месца Сямёна Шапіры заняў дэпутат Палаты прадстаўнікоў Міхаіл Русы. Для ўраджэнца Жыткавіцкага раёна такая праца не новая. Ад лютага 2001 да чэрвеня 2003 Русы ўжо займаў пасаду міністра сельскай гаспадаркі.

Міхаіл Русы з'яўляецца лідэрам Аграрнай партыі. Быў старшынём камітэта па зямельнай рэформе пры ўрадзе, міністрам прыродных рэсурсаў і навакольнага асяроддзя, кіраўніком аддзялення пасольства Беларусі ў Санкт-Пецярбургу.

Цікава, што ў 2003 годзе Лукашэнка звальняў Русага з фармулёўкай «за здзек з вяскоўцаў». «Я трываць больш гэтага не маю намеру. Вінаватыя павінныя несці адказнасць. Народу такая ўлада не патрэбная. Ніякіх кампрамісаў быць не павінна», — крычаў тады Лукашэнка.

### Батуру на амбразуру

Найбольш нечаканым выглядае прызначэнне Барыса Батуры кіраўніком Мінскага аблвыканкама. Батура вельмі доўгі час займаў такую пасаду на Магілёўшчыне. За гэты перыяд чыноўнік заслужыў сабе добрую рэпутацыю сваім уменнем працаваць з людзьмі і разумным менеджментам.

Калі яго толькі прызначалі кіраўніком Магілёўшчыны, вобласць была ў эканамічнай яме. Аднак за гады кіравання Батуры ў вобласці пачаўся бурны эканамічны рост, не ў апошнюю чаргу за кошт шчодрых інвестыцый з цэнтра.

Падначаленыя адзначаюць інтэлігентнасць Батуры. За час ягонага знаходжання на пасадзе старшыні аблвыканкама аблічча Магілёва змянілася ў лепшы бок.

У верасні 2008 года Батура па «прэзідэнцкай квоце» трапіў у Савет рэспублікі, а потым стаў яго спікерам. Гэта разглядалася як сінекура для паважанага, заслужанага — і хворага — чалавека. Цяпер жа 63-гадовага Батуру зноў кідаюць на адказны ўчастак працы.

### З іншай палаты

Дарэчы, на новую працу Батура перайшоў у кампаніі з чалавекам з парламента, але з іншай палаты. Валер Іваноў зараз будзе не намеснікам спікера Палаты прадстаўнікоў, а Мінаблвыканкама. Раней Іваноў быў старшынём Шклоўскага райвыканкама.

Напэўна, напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў Лукашэнка не адважыўся прызначыць у аблвыканкам неабстралянага, маладога кіраўніка. А прыязны Батура здольны гарантаваць народную падтрымку ў сваім рэгіёне.

### Крупца без працы не пакінулі

Незадаволенасць працай былога кіраўніка Мінаблвыканкама Леаніда Крупца Лукашэнка выказваў даўно.

У красавіку падчас знаходжання ў Любанскім раёне Лукашэнка сказаў: «Дзе недакладная інфармацыя — адразу інфармуйце мяне, прымем рашэнні аж да адстаўкі людзей. Па губернатару разбярэмся і па міністру таксама, а то губернатару хлусяць, а ён — мне. Гэтага не павінна быць».

Але як Крупец чалавек харошы і надзейны, то без працы яго пакінуць не маглі. Стаў намеснікам спікера Савета рэспублікі.

Спікерам жа верхняй палаты парламента абраны фізік, а пасля ідэолаг Анатоль Рубінаў. Гэты чалавек сталінскіх поглядаў неаднакроць прыцягваў да сябе ўвагу сваімі адыёзнымі заявамі. На новай пасадзе ён шкоды не наробіць: старшыня Савета рэспублікі нічога не вырашае.

**Зміцер Панкавец**



PHOTO.BYMEDIA.NET

Сямён Шапіра мае рэпутацыю цвёрдага рыначніка...



...а Барыс Батура (справа) умее працаваць з людзьмі.

**«Гарадзенцы — гэта тыя ж палешукі, толькі са знакам якасці»**

Так сказануў прызначаны Лукашэнкам кіраўніком Гродзенскай вобласці Сямён Шапіра ў часе ягонага прадстаўлення. Гэты момант прагучаў у рэпартажы тэлеканала СТВ.

«Але мы, палешукі, не крыўдуем, — каментуе Васіль Сёмуха, нараджэнец Пружаншчыны. — Хай ужо будзе той знак якасці. Мы людзі балотныя, мы яшчэ ў пасталах ходзім, ямо таўчаніну, людзі цёмныя, таму і не крыўдуем, што без знаку якасці. Дарэчы, для нас, палешукоў, гарадзенцы, пачынаючы ад Ружанскай пушчы, — гэта ліцвіны. Мой хутар Ясенец, і калі хтосьці ехаў у бок Гарадзеншчыны, у нас казалі «ехаць да ліцвіноў». Паверце, мы вельмі моцна адрозніваемся па мове».

«Фраза пасуе, вядома, — разважае лінгвіст Фёдар Клімчук, унікальны знаўца палескіх гаворак. — Гарадзенцы любяць сябе называць мяшчанамі. Гэта не тое самае, што назвацца селянінам ці проста палешуком. Але самі сябе людзі ў нас рэдка называюць палешукамі, гэта больш кніжнае слова. І вядома, калі ўжо так называюць, то з гонарам і сябе толькі хваляць».

**Настасся Шамрэй**

## Сцісла

• **Бакіеў з'ехаў з Беларусі на адпачынак у Турцыю.** Зрынуты прэзідэнт Кыргызстана Курманбек Бакіеў пакінуў Беларусь і знаходзіцца на адпачынку ў Турцыі, паведаміла дыпламатычная крыніца ў Маскве. Паводле яе словаў, Бакіеў знаходзіцца на курорце Белек.

• **Мілінкевіч наведае ЗША.** Візіт працягнецца чатыры дні. У межах візіту адбудуцца сустрэчы ў Кангрэсе, Дзяржаўным дэпартаменце і арганізацыях, якія працуюць з Беларуссю.

• **Урад Беларусі і Міжнародны валютны фонд восенню ацэняць неабходнасць новай праграмы супрацоўніцтва.** Пра гэта 25 мая на брыфінгу ў Мінску паведаміў кіраўнік місіі МВФ па Беларусі Крыс Джарвіс.

• **Просты беларускі трактарыст спыніў інтэрнэт.** У Мінску на Паўднёвым Захадзе каля рэстарана «МакДональдс» безыменны трактарыст унёс карэктывы ў працу некалькіх буйных інтэрнэт-правайдэраў. У выніку інтэнсіўнай працы кіроўцы трактара аказаліся пашкоджанымі оптавалаконныя лініі «Атлант-Тэлекама» і «Белінфанэта», а таксама тэлефонная магістраль «Белтэлекама».

**ЗП**

## Арцём Дубскі: Зона — гэта вялізная школа

25 мая раніцай з магілёўскай калоніі быў вызвалены актывіст Маладога Фронту Арцём Дубскі. Ён адбываў гадавое пакаранне за ўхіленне ад адбыцця «хатняй хіміі». Яшчэ ў красавіку 2008 года за ўдзел у акцыі пратэсту прадпрымальнікаў па «справе чатырнаццаці» Арцём быў асуджаны на два гады абмежавання волі.

**«Наша Ніва»: Наколькі цяжка табе даўся гэты турэмны тэрмін?**

**Арцём Дубскі**: Зона — гэта вялізная школа. Усе 10 месяцаў, што там знаходзіўся, я спрабаваў нечаму вучыцца. Турма змяніла маё бачанне свету. Пакуль яшчэ не разабраўся, у лепшы ці горшы бок.

**«НН»: А як здароўе?**

**АД**: Здароўе ў турме падарваў. Гэтым пытаннем маю заняцца найбліжэйшым часам. Праблемы найбольш са страўнікам. З зубамі таксама, бо ў турме няякасная вада. Са зрокам бяда. Калі садзіўся, то зрок быў -0,9, то цяпер ужо -2. Калі б там былі яшчэ якія-небудзь лекі. Медсястра, калі бярэ кроў з вены, то можа не патрапіць пяць разоў. Усё гэта таму, што адсутнічае кантроль. Няма на каго паскардзіцца.

**«НН»: А адміністрацыя калоніі як да цябе ставілася?**

**АД**: Адміністрацыя спачатку спрабавала са мной дамовіцца, потым запалохаць. Апошнім часам імкнуліся проста мяне кантраляваць. Хаця з тымі ж міліцыянтамі за грошы можна было лёгка дамовіцца, каб яны прынеслі мабільнік пазваніць дадому.

**«НН»: Турма табе нешта дала?**

**АД**: Вопыт камунікавання з людзьмі, каротка і па сутнасці. У турме я набыў карысныя сувязі. І гэта незвычайныя крымінальнікі, а людзі, якія могуць і ўмеюць зарабляць грошы, дырэктары дзяржпрадпрыемстваў. Яны таксама па вызваленні гатовыя нам дапамагаць.

**«НН»: Што будзеш рабіць цяпер?**

**АД**: Спачатку трэба добра адпачыць. Агледзецца. Не факт, што я буду працаваць з усімі, з кім працаваў да гэтага. Турма змяніла маё бачанне некаторых пытанняў.

**Гутарыў ЗП**

## БХД фармуе альтэрнатыўны ўрад

### Аргкамітэт партыі «Беларуская хрысціянская дэмакратыя» выступіў з ініцыятывай утварыць ценевы ўрад для адзінага кандыдата ў прэзідэнты.

Плануецца, што ў склад альтэрнатыўнага ўраду ўвойдзе не менш за 20 ценевых міністраў — адмыслоўцаў у галінах дзяржаўнага кіравання, эканомікі, сацыяльнай палітыкі, адукацыі і культуры.

«На гэтым тыдні мы плануем удакладніць наш спіс кандыдатаў з розных палітычных сіл, беспартыйных. Паралельна вядуцца кансультацыі з іншымі кандыдатамі на пасаду прэзідэнта, выслухоўваем іх прапановы. У чэрвені мы хочам правесці вялікую канферэнцыю з удзелам кандыдатаў у прэзідэнты, на якой і назавем імёны ценевых міністраў», — кажа сустаршыня БХД Павел Севярынец.

«Гэтыя міністры стануць стрыжнем будучай кампаніі, яе рухавікамі. Кожны тыдзень нехта з міністраў будзе прэзентаваць сваю праграму і рэформу ў нейкай сферы. Можна, канечне, напісаць гэта на паперы, але ад жывых людзей эфект будзе большы», — працягвае палітык.

Севярынец пакуль не хоча называць тых асоб, што могуць увайсці ў ценевы ўрад. «Гэта будуць самыя розныя людзі — ад прафесара Івана Нікітчанкі да юрыста Сяргея Луканіна».

**ЗП**

# Магнаты XXI стагоддзя

## Хто валодае беларускімі гіпермаркетамі?

Пакуль што ў краіне працуе ўсяго дзесяць гіпермаркетаў.

Пасля знікнення з вуліц Мінска кіёскаў пакупнікі былі вымушаныя звярнуць сваю ўвагу на рынкі і супермаркеты. У перспектыве крыж будзе пастаўлены і на рынках сталіцы.

Зялёнае святло загарэлася толькі перад уласнікамі вялікага бізнесу.

Вялікі бізнес — вялікія грошы. Уладальнікі гіпермаркетаў радасна паціраюць рукі — іх аўдыторыя павялічваецца пастаянна. І гэта нягледзячы на тое, што цэнаўтварэнне ў беларускіх гіпермаркетах прынцыпова адрозніваецца ад заходніх. У Еўропе і Амерыцы гіпермаркеты — значыць, нізкія кошты. У нашай краіне цэны адрозніваюцца неістотна, а сапраўдных зніжак амаль не знойдзеш.

### Праваленая праграма

У сярэдзіне 2006 года беларускі ўрад зацвердзіў праграму развіцця ўнутранага гандлю краіны на 2006–2010 гады. Тэрмін выканання праекту падыходзіць да свайго лагічнага завяршэння, але ягоныя асноўныя палажэнні далёкія ад рэалізацыі. «Першы кірунак развіцця рознічнай гандлёвай сеткі — узбуйненне памераў крам за кошт будаўніцтва і адкрыцця гіпер- і супермаркетаў і гандлёвых цэнтраў.

У 2010 годзе колькасць крамаў з гандлёвай плошчай больш за 1000 квадратных метраў павінна складаць 116 адзінак», — гаварылася ў праграме.

Гіпермаркеты мусілі з’явіцца ў кожным абласным цэнтры Беларусі, а ў ідэале — і ў кожным раёне Мінска. Ідэя правалілася, у першую чаргу — у рэгіёнах.

### Што такое гіпермаркет?

Варта ўнесці яснасць у азначэнні. Гіпермаркетам лічыцца крама з гандлёвай плошчай больш за 5000 квадратных метраў і асартыментам тавараў, які налічвае больш за 40 тысяч найменняў.

Спіс беларускіх крамаў, якія адпавядаюць прыведзеным паказчыкам, складае ўсяго 10 адзінак. Абсалютная большасць з іх — 70% — знаходзіцца ў сталіцы.

Тыя, хто здолеў запусціць бізнес, апынуліся ў золаце. Хто ж валодае найбуйнейшымі крамамі краіны, абарот якіх складае дзесяткі мільярдаў рублёў штомесяц? Дастаткова сказаць, што сярэдняя сума па чэку ў гіпермаркеце складае 60–65 тысяч рублёў.

### «Прастор»

Сетка гіпермаркетаў «Прастор» налічвае ўжо тры крамы. Усе яны знаходзяцца на выездах у Мінску па адрасах Дзяржынскага, 126, Партызанскі праспект, 182 і Убарэвіча, 176. Дзве апошнія былі адкрытыя зусім нядаўна, зімой і вясной 2010 года. Кожны з гіпермаркетаў параўнальна невялікі, з плошчай па 6–8 тысяч квадратных метраў.

Кантрольным пакетам акцый «Прастормаркет» валодае расійская кампанія «Сёмы кантынент». У 2006 годзе яна выкупіла 50% акцый у «Трайпла», беларускага бізнесоўца Юрыя Чыжа. Праз некаторы час расійцы даплацілі $5 мільёнаў і павялічылі сваю долю да кантрольнай.

Такім чынам, Чыж і «Трайпл» захавалі 49% акцый. Уладальнік «Сёмага кантынента», расійскі алігарх Аляксандр Занадвораў, мае 38% акцый «Прастора», яшчэ 15% акцый сканцэнтравана ў руках іншых расійскіх акцыянераў.

### «Бігз»

Першым беларускім гіпермаркетам BIGZZ (Бігз) валодае СТАА «Баніяр». Кампанія была заснаваная ў 2004 годзе і раней займалася продажам польскага адзення і абутку. Крама знаходзіцца на скрыжаванні Лагойскага тракта і МКАДа, юрыдычна адносіцца да Мінскага раёна і, адпаведна, плаціць падаткі ў раённы бюджэт.

Тэрыторыю даводзіцца арандаваць у ЗАТ «Выставачны цэнтр «Аквабел». Старшыня сходу акцыянераў кампаніі — былы навукоўца і супрацоўнік БДАТУ Пётр Сінкевіч. Дарэчы, «Аквабелу» належыць і паркоўка каля гіпермаркета.

Гандлёва-выставачны цэнтр «Экспабел», у які ўваходзіць і BIGZZ, мае агульную плошчу памерам 31 тысяча квадратных метраў. Гэта найбольшы паказчык для гандлёвых цэнтраў Беларусі.

### «Гіпа»

Гіпермаркеты GIPPO («Гіпа»), сімвалам якіх з’яўляецца сімпатычны аранжавы гіпапатам, маюць прадстаўніцтвы ў Мінску і Магілёве. Сталічны адрас — праспект Ракасоўскага, 2. Рэгіянальны — Маўчанскага, 6. Апроч таго, у Мінску працуе шэраг сеткавых супермаркетаў.

«Гіпа» — адзін з профіляў англійскага замежнага прадпрыемства «БелВілесдэн». Яго кіраўніком з’яўляецца Алег Бараноўскі. Сярод іншых ягоных інтарэсаў — кампанія «Белхімэнерга», якая робіць электрамантажныя паслугі, і пастаўкі морапрадуктаў з «Аквапрамрэсурс».

### «Карона»

Яшчэ адзін брэнд, які выйшаў за межы Мінска, — гіпермаркет «Карона». Крама пад такой шыльдай ужо адкрылася ў Брэсце (вул. Маскоўская, 210), у найбліжэйшы час чакаецца і пачатак працы ў Бабруйску. У сталіцы гіпермаркет знаходзіцца ў цэнтры горада, па адрасе Кальварыйская, 24. Плошча мінскага аб’екта — 18,5 тысяч квадратых метраў. На тэрыторыі знаходзіцца яшчэ і супермаркет «Карона-тэхна».

Уладальнікам паспяховага бізнесу з’яўляецца «Табак-інвест». На долю кампаніі прыпадае больш за 30% імпарту тытуню і цыгарэтаў у краіну.

Бізнес узначальваюць старшыня праўлення, выхадзец з Грузіі Павел Тапузідзіс і дырэктар Віктар Пятровіч.

Мінскі і брэсцкі гіпермаркеты «Карона» не трэба блытаць з аднайменным гандлёвым цэнтрам у Гродне, які належыць Лазару Нісаеву.

### «Еўраопт»

Гіпердыскаўнтэр «Еўраопт», як і «Бігз», адносіцца да тэрыторыі Мінскага раёна, бліжэй да гродзенскага выезду з горада. Адрас — Мантажнікаў, 2. Плошча — 11 тысяч квадратных метраў. Да крамы ходзяць бясплатныя аўтобусы ад Каменнай Горкі і мікрараёна Брылевічы. Гэта першая гіперкрама ў Беларусі, якая працуе па прынцыпе «найменш сэрвісу — найменшыя цэны». Крамы меншага памеру прадстаўленыя ў Мінску, Гродне, Магілёве, Мазыры і іншых гарадах.

Уладальнік бізнесу, кампанія «Еўраторг», вядзе сваю гісторыю ажно з 1993 году. Яе росквіт прыпаў на час кіравання Сяргея Літвіна. Бізнесоўца кантраляваў Мінскі завод вінаградных вінаў і Мінскі мелькамбінат. Пасля таго як супраць Літвіна і яго партнёра Васількова ў 2003 годзе была заведзеная крымінальная справа, яны выехалі ў эміграцыю ў Польшчу. Абвінавачанні з цягам часу былі знятыя, але ў Беларусь бізнесоўцы не вярнуліся. Цяперашні кіраўнік «Еўраторга» — Андрэй Зубкоў.

### «Алмі»

Гродзенскі гіпермаркет «Алмі» (вуліца Касманаўтаў, 81) належыць расійскаму бізнесу — кампаніі «Вікторыя», але мае беларускае адценне.

Рэч у тым, што суўладальнік расійскай кампаніі Аляксандр Зарыбка, які якраз займаецца развіццём сеткі крам АЛМІ, нарадзіўся ў Пінску. Гіпермаркет пад карпаратыўнымі зялёнымі колерамі працуе ўсяго адзін, але меншыя крамы функцыянуюць у Мінску, Пінску, Оршы і іншых беларускіх гарадах.

**Яўген Васількоў**



PHOTO.BYMEDIA.NET

**У кожнай такой краме прадаецца больш за 40 тысяч тавараў.**

## Мыты на аўтамабілі пакуль застаюцца ранейшымі

### Мытны саюз пагражае стаць другім «даўгабудам» пасля саюзнай дзяржавы.

З 1 ліпеня 2010 Мытны саюз Расіі, Беларусі і Казахстана не запрацуе на поўную моц, як гэта меркавалася раней. Пра гэта расказаў 21 мая прэм'ер-міністр Расіі Уладзімір Пуцін пасля шматгадзінных перамоваў з калегамі-прэм’ерамі. Узгадніць пазіцыі наконт Мытнага кодэкса ім не ўдалося.

Кожны з бакоў мае сваё балючае пытанне. Расію непакоіць лёс аўта- і авіяпрамысловасці, а Беларусь увязвае мыты на ўвоз аўтамабіляў з саступкамі ў пытанні мытаў на нафту і нафтапрадукты.

Краіны дамовіліся працягнуць абмеркаванне Мытнага кодэкса.

Мытны саюз Расіі, Беларусі і Казахстана фармальна пачаў дзейнічаць з 1 студзеня 2010 года, аднак паўнавартасны саюз і адзіная мытная тэрыторыя з’явіцца толькі пасля набыцця моцы супольнага мытнага кодэкса. Кодэкс меў запрацаваць 1 ліпеня 2010 года, але дата, як бачым, сарвалася.

**ЯВ**

## Накат «Газпрома» на Беларусь

### Беларусь пастаянна недаплачвае за расійскі газ — доўг склаў ужо амаль $200 мільёнаў.

Такія падлікі прыводзяць эканамісты «Газпрома». Яны сцвярджаюць, што Беларусь плаціць за «блакітнае паліва» цану, якая падабаецца ёй самой.

У першым квартале вызначаная цана расійскага газу для Беларусі складала $168,7 за 1 тыс. кубаметраў, у другім яна вырасла да $184. Аднак беларускі бок з першага кварталу плаціць па сярэднегадавой цане мінулага года — $150 за 1 тыс. кубоў. Менавіта такую цану рэспубліка прасіла захаваць для яе і на першы квартал 2010 года, але Расія на гэта не пайшла.

«Газпром» можа абмежаваць пастаўкі газу ў Беларусь, калі яна не верне пазычанасць перад манапалістам у памеры $137 мільёнаў, паведамляюць расійскія «Ведомости» са спасылкай на крыніцы, блізкія да газавага канцэрну.

**ЯВ**

## Сцісла

• **На шляху да $500.** Каб да канца года забяспечыць паскораны рост заробкаў, будзе скарэктаваны графік павышэння тарыфнай стаўкі першага разраду на 2010 год. Ранейшы прадугледжваў рост нарматыву 1 красавіка, 1 верасня і 1 лістапада 2010 года. Аднак эканамічныя магчымасці дзяржавы не дазволілі прытрымлівацца графіку.

• **Крэдыт на жыллё — 15%.** Услед за зніжэннем стаўкі рэфінансавання «Беларусбанк» паменшыў працэнт па крэдытах на будаўніцтва жылля. Раней грамадзяне, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоваў, маглі ўзяць грошы пад 17%.

• **Маршруткі — плюс 400 рублёў.** Мінскія маршруткі нарэшце падаражалі. Кошт праезду на маршрутах, карацейшых за 10 км, складзе 1750 рублёў, звыш 10 км — 2250 рублёў. Папярэдняе павышэнне цаны было ў лістападзе 2008 года.

• **Дэфіцыт рэспубліканскага бюджэту за студзень—красавік 2010 года склаў 1,3 трлн рублёў, паведамляе Міністэрства фінансаў Беларусі.** Па выніках першага кварталу гэты паказчык складаў 480 млрд. Па выніках года дэфіцыт рэспубліканскага бюджэту можа скласці 3,6 трлн руб.

**ЯВ**

# Расійскія машына забуксавалі на чэхах

**У нядзелю 23 мая скончыўся 74–ы чэмпіянат свету па хакеі.**

У вырашальным паядынку сышліся Расія і Чэхія. Гэта нібыта паўтарэнне фіналаў паміж СССР і Чэхаславакіяй трыццацігадовай даўніны. Сёння былыя чэшскія хакеісты прызнаюцца, што на тыя матчы яны настройваліся адмыслова, памятаючы танкі на пражскіх вуліцах у 1968 годзе.

Галоўная чэшская зорка сучаснага хакея **Ярамір Ягр (на фота)** мае на майцы ўсё той жа 68-ы нумар. «Гэты швэдар я нашу не таму, што кепска стаўлюся да расійцаў. А таму, што не люблю камуністаў», — кажа Ягр.

Ягоны дзед, таксама Ярамір, памёр у турме ў тым самым 1968-м. За краты ён трапіў пасля таго як адмовіўся ўвайсці ў камуну.

На гэты чэмпіянат чэхі прывезлі абноўленую зборную, якая не далічылася многіх зорак. Ягр публічна ўшчуваў сваіх зорных суайчыннікаў, якія, спаслаўшыся на розныя прычыны, адмовіліся выступаць за зборную.

**Дзед Яраміра Ягра быў асуджаны за палітыку і памёр у турме ў 1968–м.**

Чэхі пачалі чэмпіянат ні ладна ні складна. Прайгралі нарвежцам, і ледзь-ледзь трапілі ў чвэрцьфінал. Такім чынам, плэй-оф для іх пачаўся значна раней. І чэхі літаральна на зубах перамагалі канадцаў, фінаў і шведаў. І выйшлі ў фінал.

Там іх чакалі расійскія зоркі. Расійцы змаглі сабраць наймацнейшы склад — Кавальчук, Авечкін, Малкін, Дацюк, Фёдараў. Усё гэта найвялікшыя зоркі сучаснага хакея.

Але ўжо на 20-й секундзе гульні Ягр выдаў бліскучую перадачу на Якуба Клепіша, які расстраляў пустую браму. У другім перыядзе Ралінэк павялічыў перавагу.

У апошняй трэціне гульні расійцы перайшлі на адкрытыя грубасці. Ямелін балюча ўдарыў усё таго ж Ягра пад калена. Чэх ледзьве дакульгаў да лаўкі запасных. А Ямеліна выдалілі да канца сустрэчы.

На апошніх секундах Дацюк адыграў адну шайбу. Але гэтага было замала. Чэхія пасля гэтай перамогі гуляла ўсю ноч.

Цікава, што ніводзін чэшскі хакеіст не трапіў у сімвалічную зборную першынства, якую складалі эксперты і журналісты.

Дарэчы, гэта не адзіная перамога чэхаў у Нямеччыне. Было вырашана, што чэмпіянат 2015 года прыме Прага.

Беларусы ў Германіі занялі дзясятае месца, у рэйтынгу скаціліся таксама на яго. Налета ў Славакіі наша каманда згуляе з Канадай, Швейцарыяй і Францыяй.

**Зміцер Панкавец**





# Арганізатары акцыі «Стоп бензін!» заклікаюць байкатаваць запраўкі

**Так яны пратэстуюць супраць падвышэння цэнаў на паліва.**

Нядаўняе падаражанне бензіну абурыла многіх аўтааматараў. За няпоўныя пяць месяцаў з пачатку года цэны на паліва павышаліся тройчы і выраслі ўжо на 15%. Аўтамабілісты таксама гавораць аб тым, што з сярэдзіны 2004 года цэны на бензін выраслі ў два, а на дызельнае паліва — у два з паловай разы.

У выніку сярод наведнікаў сайтаў «Аўтамалінаўка», stop-gai.by і некаторых іншых нарадзілася ідэя пратэстнай акцыі «Стоп бензін!». Ініцыятары акцыі заклікаюць неабыякавых кіроўцаў 1—4 чэрвеня ігнараваць некаторыя аўтазаправачныя станцыі.

«Мы вырашылі не маўчаць, аб'явілі грамадзянскую ініцыятыву «Мы — не дойныя каровы», — расказвае актывіст гэтай кампаніі Канстанцін Міхайлаў. — З Расіі да нас ідзе бяспошлінная нафта, прызначаная для продажу на нашым унутраным рынку зусім не па тых цэнах, па якіх нам прыходзіцца яе купляць.

Мы заклікаем усіх неабыякавых з 1 па 4 чэрвеня праігнараваць запраўкі канцэрна «Белнафтахім», а запраўляцца на станцыях АСТА, «Славнефть», «Юнайтэд компані». Мы хочам паказаць, што мы не станем маўчаць, бо разбіраемся ў цэнах. Акрамя таго, нас хвалююць усе праблемы, якія ёсць у нашай дзяржаве».

**Паводле БелаПАН**

# Журналісты сабраліся, міністры праігнаравалі

**Дыпламаты Еўракамісіі і Балгарыі адкрылі дыпламатычную Беларускую дыктоўку.**

24 мая ў вялікай зале Гістарычнага музея адбыўся чарговы этап Нацыянальнай дыктоўкі — дыпламатычны. Гэтая традыцыя была запачаткаваная два гады таму з ініцыятывы тагачаснага пасла Славакіі ў Беларусі Любаміра Рэгака.

Сёлета дыктоўкай апекавалася прадстаўніцтва Еўракамісіі ў Беларусі, запрашэнні зыходзілі ад пасла Хольцапфеля. Гэта давала надзею на прысутнасць высокага рангу афіцыйных удзельнікаў з Беларусі. Запрашэнні былі накіраваныя міністру культуры Паўлу Латушку, кіраўніцтву Міністэрства замежных справаў, кіраўнікам тэлеканалаў, галоўным рэдактарам «Советской Белоруссии» і «Звязды». Ніхто з іх не прыйшоў.

Афіцыйны бок рэпрэзэнтавалі пасол па асаблівых даручэннях МЗС Уладзімір Шчасны і гаспадар, дырэктар Гістарычнага музея Сяргей Вечар.

Дыктоўка праходзіла ў дзень святых Кірылы і Мяфодзія — Дзень славянскай пісьмовасці і культуры. Таму суарганізатарам выступала пасольства Балгарыі ў Беларусі. А У.Шчасны цытаваў «Малітву» не толькі Купалы, але і Боцева.

У веданні беларускай мовы сярод дыпламатаў няма роўных паслу Швецыі Стэфану Эрыксану. Ад яго вучыліся прысутныя амбасадар Венгрыі Ферэнц Контра, Ізраіля — Дані Шапіра, Балгарыі — Захары Радукаў.




**Злева направа: паслы Жан-Эрык Хольцапфель, Стэфан Эрыксан і Ферэнц Контра з Бібліяй па-беларуску.**

Усім ім сын перакладчыка Біблії на беларускую мову Васіля Сёмухі, бізнесовец і выдавец Біблії Сяргей, падараваў экзэмпляры выдання. Біблії не падпісваюць, таму перакладчык на форзацы занатаваў проста асобныя радкі з кнігі. Сам спадар Васіль быць не змог праз нядужасць, але прыслаў падарунак музею — друкарскую машынку, на якой набіраўся пераклад.

Усё гэта здымалі тэлеканалы, якія сабраліся ў поўным складзе.

А тады пачалася самое dictando, пад пільным вокам вялікіх князёў Вітаўта і Альгерда — у зале дзейнічае выстава партрэтаў дзеячоў Вялікага Княства аўтарства розных мастакоў і скульптараў.

Як замежнік замежніку дыктаваў пабеларуску — гэта варта было чуць. Але неяк жа пісалі. Каб выказаць павагу да нашай мовы.

**Мікола Бугай**

## Беларускамоўныя школы сталіцы

Набор у першыя класы пачнецца з 1 чэрвеня. Прапануем падрабязную інфармацыю, адрасы і кантакты.

**Гімназія №4 (вул. Кунцаўшчына, 18)** прапануе навучанне ў фізіка–матэматычных, хіміка–біялагічных і філалагічных класах.

Даведка: e–mail: gymn4.minsk.edu.by, т.258–49–71, 258–49–74.

***

**Гімназія №9 (вул.Сядых, 10)** — вывучэнне ўсіх прадметаў па–беларуску, паглыбленае вывучэнне англійскай мовы, факультатыўнае — польскай. Прапануе вывучэнне прадметаў музычнага цыклу.

Даведка: т.283–04–21, 281–38–04.

***

**Гімназія №23 (пр. Незалежнасці, 45)** прапануе вывучэнне прадметаў па–беларуску, а таксама выкладанне на высокім узроўні англійскай, кітайскай, польскай моваў.

Даведка: e–mail: gymn23@minsk.edu.by; т.284–47–62, 284–87–16.

***

**Гімназія №28 (пр.Ракасоўскага, 93)** прапануе выкладанне ўсіх прадметаў на роднай мове, а таксама паглыбленае вывучэнне французскай мовы, міжнародныя абмены, а таксама выкладанне прадметаў на французскай мове (краіназнаўства, літаратура Францыі) па праграмах, распрацаваных настаўнікамі школы.

Даведка: e–mail: sch2@minsk.edu.by.; т.248–32–02, 248–12–64.

***

**Гімназія №14 (вул. Васняцова, 10)** прапануе паглыбленае вывучэнне замежных моваў, спецкурсаў па міфалогіі, псіхалогіі, асновах эканамічных ведаў, журналістыцы і шмат іншага. На базе гімназіі дзейнічаюць фальклорны ансамбль, музеі, літаратурная студыя і студыя бальных танцаў.

Даведка: т.295–01–33, 295–21–31.

***

**СШ №190 (вул.Нікіфарава, 19)** — выкладанне на беларускай і расійскай мовах. Школа прапануе таксама бясплатную музычную адукацыю і спартыўныя секцыі.

Даведка: т. (017) 260–24–90; e–mail:sch190@minsk.edu.by

***

**Школа №60 (вул.Лібкнехта, 82)** — навучанне з музычным ухілам. У школе дзейнічаюць шматлікія гурткі, клубы, музей, творчыя і грамадскія аб'яднанні.

Даведка: 208–69–74, 209–94–49.

***

**СШ №68 (зав. Ахоцкі, 17)** прапануе навучанне па–беларуску. Набор у класы з фальклорна–тэатральным напрамкам.

Даведка: e–mail: sch68@minsk.edu.by; т. 243 76 82.

Да чытачоў. Дасылайце ў рэдакцыю інфармацыю пра беларускамоўнае навучанне ў вашай вобласці і раёне. Пішыце пра новыя ініцыятывы бацькоў і ўпраўленняў адукацыі.

**Сямён Печанко**


АЛЯКСЕЙ ДРАБЕНЯ, «ІНФА-КУРЕР»

# Сто фанатаў біліся ў Слуцку

19 мая ў Слуцку каля парка адбыўся футбольны чын.

Схапіліся заўзятары футбольных каманд «Слуцкцукар» і «Маладзечна». У момант, калі адбылася бойка, ішоў першы тайм матчу паміж гэтымі камандамі. У высвятленні адносін, якое доўжылася пару хвілін, удзельнічала больш за сотню маладых людзей. На баку «Слуцкцукра» біліся хлопцы з Слуцка і іх суседзі — заўзятары салігорскага «Шахцёра». Падтрымаць кулакамі «Маладзечна» прыехалі, апроч маладзечанцаў, яшчэ і мінчукі. Каб у бойцы адрозніваццa ад «гаспадароў поля», госці паскідалі кашулі. Людзі, што апынуліся побач са здарэннем, хутчэй уцякалі ад раз'юшанай моладзі. Разагнаць фанатаў здолеў толькі ўзброены нарад міліцыі.

Паводле інфармацыі начальніка Слуцкага РАУС Сяргея Цішкевіча, затрымалі 51 асобу: 18 случчакоў, 5 салігорцаў, 26 маладзечанцаў і мінчукоў. Фанатаў «Слуцкцукра» пасля афармлення пратаколаў затрымання і прафілактычных гутарак паадпускалі дамоў. Маладзечанцаў і мінчукоў пасля аналагічных працэдур у суправаджэнні міліцэйскіх машын праводзілі да мяжы Слуцкага раёна і каля поўначы перадалі Уздзенскай міліцыі для далейшага суправаджэння. Сур'ёзных пашкоджанняў падчас інцыдэнту ніхто не атрымаў, таму крымінальныя справы ў дачыненні да маладых людзей не ўзбуджаліся. Пасля здарэння міліцыя ва ўзмоцненым рэжыме патрулявала вуліцы горада, каб перадухіліць новыя сутыкненні.

**Алесь Пілецкі**

## Кардынал Свёнтак: аперацыя прайшла паспяхова


PHOTO.BYMEDIA.NET

Найстарэйшы каталіцкі святар зламаў шыйку сцягна.

Улічваючы ўзрост пацыента, а таксама тып пералому, медыкі Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра траўматалогіі і артапедыі паставілі Свёнтку не пратэз, а металаканструкцыю. Такая аперацыя трохі прасцейшая. Для кардынала вылучылі асобны блок.

Дарэчы, Свёнтак — найстарэйшы ў Беларусі каталіцкі святар. Дый у свеце мала знойдзецца дзейных прэлатаў такіх гадоў. На сёння найстарэйшымі кардыналамі лічацца італьянец Эрзільё Таніні і беларус Свёнтак. Ім па 95 гадоў.

Кардынал Свёнтак, народжаны ў Эстоніі ў польскай сям'і, пераехаў на тэрыторыю Беларусі маладым. У сталінскія часы яго асудзілі на смерць, аднак з камеры смяротнікаў Брэсцкай турмы ён выйшаў, бо Германія напала на Савецкі Саюз. Пасля вайны ён усё ж адседзеў дзесяць гадоў у лагерах.

Кардынал узначаліў адраджэнне касцёла ў Беларусі пасля падзення Савецкага Саюза і ўсім сэрцам падтрымаў курс на яго беларусізацыю. Кардынала шануюць як старэйшае, так і маладое пакаленне касцёла.

**Мікола Бугай**

## 1 чэрвеня сканчаецца запіс на цэнтралізаванае тэставанне

Само ЦТ пройдзе ад 14 чэрвеня да 5 ліпеня.

Што тэставанне праводзіцца ў такія кароткія тэрміны, выклікае незадаволенасць у міністра адукацыі Аляксандра Радзькова. «Чаму ў Англіі можна здаць тэст на паступленне ў студзені, а ў нас трэба здаваць тры ў чэрвені?» — цытуе словы міністра БелаПАН. А. Радзькоў выказаўся за тое, каб распрацаваць тэсты за курс дзесяці класаў. На яго думку, гэта дазволіла б здаваць тэсты не толькі выпускнікам, але і ўсім ахвотным. Мяркуючы па тых зменах, што апошнія некалькі гадоў скаланаюць сістэму адукацыі (вяртанне да 11-гадовага навучання; адмова ад паглыбленай замежнай мовы, а пасля яе вяртанне; распрацоўка «Кодэкса аб адукацыі»), словы міністра ўжо налета могуць матэрыялізавацца.

Сёлета ж чакаецца, што сцены сярэдніх школ пакіне каля 88 тысяч вучняў. З іх каля 18 тысяч — выпускнікі беларускамоўных класаў.

ВНУ на ўсе формы навучання гатовыя набраць аж 102,7 тысячы абітурыентаў. Нават калі дадаць выпускнікоў ПТВ, ССНУ, якія патэнцыйна з'яўляюцца абітурыентамі ВНУ, уступная кампанія не будзе напружанай. Пытанне толькі, хто трапіць на бясплатныя, а хто — на платныя аддзяленні. Хто будзе вучыцца ў сталіцы, а хто — у рэгіёнах, дзе якасць адукацыі дагэтуль горшая. Чакаць змяншэння конкурсаў і прахадных балаў на топавыя спецыяльнасці (дызайн, судовая экспертыза, маркетынг, правазнаўства) не выпадае.

**Кастусь Матушыч**

**Графік цэнтралізаванага тэставання**
14 чэрвеня — беларуская мова
15 чэрвеня — руская мова
17 чэрвеня — гісторыя Беларусі
18 чэрвеня — геаграфія
20 чэрвеня — матэматыка
22 чэрвеня — грамадазнаўства
24 чэрвеня — сусветная гісторыя найноўшага часу
25 чэрвеня — фізіка
27 чэрвеня — біялогія
29 чэрвеня — замежныя мовы
30 чэрвеня — хімія
5 ліпеня — рэзервовы дзень

## Прагноз на лета: NASA кажа адно, а Макей — іншае

Лета-2010 ў Еўропе стане рэкордна спякотным за ўсю сучасную гісторыю метэаназіранняў. З такім прагнозам выступілі навукоўцы з Нацыянальнага ўпраўлення ЗША па аэранаўтыцы і даследаваннях касмічнай прасторы (NASA).

«За апошнія 12 месяцаў сярэднясутачная тэмпература атмасферы Зямлі была самай высокай за ўсе папярэднія 130 гадоў, — паведаміў кіраўнік даследаванняў прафесар Джэймс Ханс. — А за студзень—красавік 2010 года тэмпература ўшчыльную наблізілася да абсалютных рэкордных паказчыкаў.

Матэматычныя мадэлі паказваюць, што тэмпература будзе расці ў наступныя месяцы, і ў Паўночным паўшар'і трэба перажыць самае спякотнае лета за ўсю гісторыю сучасных метэаралагічных назіранняў».

Паводле высноваў навукоўцаў, гарачае надвор'е — гэта наступства змяненняў у руху цёплых плыняў Ціхага акіяна, якія спрыяюць узнікненню кліматычнага феномену, вядомага як «Эль-Ніньё». Сёлета Ціхі акіян выдзяляе значна больш цяпла, чым звычайна, што вядзе да разагрэву ніжніх слаёў атмасферы Зямлі.

Тым часам, паводле народнага календара 24 мая адзначаўся прысвятак Макей (не блытаць са спасаўскім Макавеем і Уладзімірам Макеем з Адміністрацыі прэзідэнта). Другая назва свята — Макей мокры. Адпаведныя гэтаму прысвятку і прыкметы: мокра на Макея — чакай лета мокрага. Суха — і лета будзе сухім. Ад ночы і цэлую раніцу ў Мінску ліло як з вядра.

**АГ, gazeta.ru**

## Мітрапаліт Філарэт гатовы пакінуць пасаду


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Магчымасць падаўжэння служэння Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага Філарэта, Патрыяршага Экзарха ўсёй Беларусі разглядалі на паседжанні Святога Сінода РПЦ у Маскве. Пра гэта паведаміў архімандрыт Аляксей (Шынкевіч).

«Паводле Статута РПЦ, любы архірэй, які дасягнуў 75-гадовага ўзросту, абавязаны падаць на імя Патрыярха прашэнне аб сыходзе з пасады. Патрыярх, з улікам думкі Святога Сінода, мае права гэтае прашэнне прыняць альбо адхіліць. Гэтае пытанне будзе вырашацца на паседжанні Сінода», — патлумачыў айцец Аляксей.

**БЕЛТА**

## Здарэнні сцісла

• **П'яны хуліган у Гомелі падстрыг падлетка.** 21-гадовы раней судзімы жыхар Гомеля п'яны чапляўся да падлеткаў 16 і 17 гадоў. Падчас сваркі ён збіў кепку з галавы аднаго з падлеткаў і з пагрозай фізічнай сілы выстрыг валасы на галаве ў непаўналетняга. У адказ на зробленую яму заўвагу ад прахожага стукнуў апошняга кулаком у твар. У дачыненні да гамяльчаніна распачатая крымінальная справа за хуліганства.

• **Павесілася 18-гадовая дзяўчына.** Гэта адбылося ў Іванаўскім раёне Брэсцкай вобласці. Цела дзяўчыны ў паветцы знайшлі сваякі. Яна вучылася ў Пінскім педкаледжы, у той дзень прыехала дамоў на выходныя. Тым часам бацькі былі на працы, і дома нікога не было. Матывы пакуль няясныя.

• **Кіроўца збіў раварыстаў.** ДТЗ адбылося на дарозе Алёхнавічы—Гарадок (Маладзечанскі раён). 52-гадовы кіроўца легкавога аўтамабіля «Нісан» учыніў наезд на групу дзяцей, якія ехалі па дарозе на роварах. У выніку загінуў сямікласнік Алёхнавіцкай школы.

• **Прас як рэчавы доказ канфіскаваны з месца злачынства — прыватнага дома ў вёсцы Дабрынь Ельскага раёна.** Яго адбітак-апёк знойдзены на жываце 72-гадовай грамадзянкі, якая цяпер у бальніцы. Жанчына разам з 54-гадовай знаёмай ужывала алкагольныя напоі. Потым маладзейшая запатрабавала ў бабулькі грошай яшчэ на спіртное — з дапамогай праса. Ёй прад'яўленае абвінавачанне ў разбойным нападзе.

• **Дэпутатка сельсавета падазраецца ў крадзяжы ў буйным памеры.** 38-гадовая жыхарка вёскі Копцеўка (Гродзенскі раён) падазраецца ў тым, што, працуючы загадчыцай дзіцячага садка, скрала 20 млн рублёў. Распачатая крымінальная справа.

• **Першакурснік выкінуўся з 13-га паверха.** 18 мая ўраджэнец Віцебскай вобласці 1990 года нараджэння выкінуўся з балкона 13 паверха інтэрната БДЭУ. Малады чалавек памёр на месцы. Паводле звестак праваахоўных органаў, у студэнта была заніжаная самаацэнка. Ён меў праблемы з навучаннем, цяжкасці ў адносінах з людзьмі,назіраўся ў псіхіятра.

• **Насмерць прыціснула футбольнымі варотамі.** У Мінску на стадыёне «Арляня» трэцякурснік Політэхнічнага каледжа вырашыў выканаць фізічныя практыкаванні на верхняй перакладзіне варотаў для міні-футбола. Яны паваліліся і насмерць прыціснулі хлопца.

**СМ; «Звязда», БелаПАН**

# План Б: без Лукашэнкі

**Мядзведзеў і Назарбаеў абмеркавалі «магчымасць супольных дзеянняў дзвюх краін дзеля найхутчэйшага вырашэння ўсіх пытанняў фармавання Мытнага саюза». Піша Аляксандр Класкоўскі.**

Правал перамоваў трох прэм'ераў 21 мая ў Пецярбургу, што дэ-факта прызнаў Пуцін, змушае Маскву распрацоўваць варыянты выратавання свайго праекту, які ў атачэнні Мядзведзева без эківокаў называюць геапалітычным. Калі з Мінскам зварыць кашу не пашэнціць, то не выключаная і «двойка».

Зрэшты, пакуль што паказальныя кантакты з Астаной выглядаюць найперш псіхалагічным ціскам на Лукашэнку, які ад пачатку свайго прэзідэнцтва супернічаў з Назарбаевым на інтэграцыйным полі. Глядзі, маўляў, каб цяпер не застаўся з носам!

Беларускае ж кіраўніцтва прасекла, што танных энерганосьбітаў пад новай шыльдай не пабачыць як сваіх вушэй, але разам з тым добра засвоіла расійскае выслоўе «С паршивой овцы хоть шерсти клок». А раптам пад маркай Мытнага саюза хоць нейкія крыхі яшчэ пашэнціць урваць?

Увогуле ж, можа паўтарыцца ў рэдукаваным выглядзе сюжэт «саюзнага будаўніцтва», калі праект дэ-факта пахаваны, але гучыць інерцыйная рыторыка і выціскаюцца нейкія прэферэнцыі.

Пахаванне Мытнага саюза — гэта адчувальны ўдар па амбіцыях Масквы, але плюс для цывілізаваных перспектываў Беларусі.




# Спрабуем яшчэ раз?

**Расійскі оперны рэжысёр Міхаіл Панджавідзэ пагадзіўся заняць пасаду галоўнага рэжысёра Тэатра оперы і балета Беларусі. Ці зможа ён падняць беларускую оперу з руін? Піша Юлія Андрэева.**

Эпоха праўлення сп-ні Ізворскай-Елізар'евай была, мякка кажучы, неспакойнай для тэатра. З яго сыходзілі дырыжоры і артысты. Так, заблішчэлі нейкія зорачкі, якім за дырэктарствам Сяргея Картэса не было ходу. Ніна Шарубіна, Настасся Масквіна... Прыйшла плеяда таленавітых спевакоў — выпускнікоў Акадэміі музыкі. Але з імі трэ было працаваць. А якая можа быць праца ва ўмовах пастаянных канфліктаў усіх з усімі?

Спектаклі, што ставіліся, былі падазрона падобныя да старых пастановак Metropolitan Opera. У адсутнасць жорсткага дырыжорскага кантролю пачаў дэградаваць аркестр. І ніякая рэканструкцыя будынка не магла гэтага спыніць.

А тым часам за апошнія 20 гадоў у оперным мастацтве адбылася рэвалюцыя. Опера павярнулася тварам да гледача. Перахварэўшы «дзіцячай хваробай» эпатажнай рэжысуры, яна даспела да новага стылю, які спалучае ў сабе трапяткое стаўленне да аўтарскага тэксту і цікавасць для публікі. Сучасны оперны спектакль, якім мы бачым яго ў Еўропе і ў Амерыцы, найбольш падобны да ангельскага касцюмаванага фільма: прыгожыя людзі, распрацаваны антураж, вытанчаная псіхалагічная акторская ігра... І пры гэтым яшчэ — выдатныя галасы, бездакорная ігра аркестра.

Рэпертуарныя прыярытэты таксама змяніліся. Больш ставяць Моцарта, Гендэля, Беліні і Даніцэці, нават сур'ёзныя оперы Расіні. Многія з гэтых твораў настолькі складаныя для выканання, што іх не ставілі на сцэне па сто і болей гадоў.

Аднак складанасці можна пераадолець. І калі для расініеўскай «Арміды» трэба мець прыгажуню сапрана і шэсць каларатурных тэнараў, не праблема — знойдзем! Адшукаем чатырох контртэнараў са спартыўнай падрыхтоўкай для гендэлеўскага «Рынальда». Балазе, выбар не абмяжоўваецца адным тэатрам і адной краінай. А калі патрэбнага чалавека сапраўды няма, яго падрыхтуюць у опернай акадэміі.

Так працуюць у найлепшых тэатрах свету. У нас жа — падыход, часты для краіны сярэдняга памеру: спектакль майструюць з падручных матэрыялаў. Максімум, што можа з гэтага выйсці, — опера для бабулек і салдатаў тэрміновай службы, з цаной квітка ў адзін даляр. Ці так, як цяпер, — опера для экскурсантаў, куды народ ходзіць, каб пазерыць на інтэр'еры.

Падобна, спадар Панджавідзэ гэта разумее. Але ці ўдасца яму зламаць тыя адміністрацыйныя абмежаванні, якія сёння калечаць наша мастацтва? Бо ў тэатры з жорсткім штатным раскладам і не менш жорсткім фінансаваннем, са «сваімі» народнымі, заслужанымі і майстрамі сцэны запрасіць «чужынцаў» пад патэнцыйна сенсацыйныя праекты амаль немагчыма.

У выніку страчваюць усе. Публіка, якой скормліваць стандартны рэпертуар у стандартным выкананні. Таленавітыя салісты, якіх пазбаўляюць будучыні, заганяючы ў пракрустава ложа опернай руціны. Горад, які прапускае прыбытак ад папулярнага ва ўсім свеце опернага турызму.

І не трэба баяцца, што беларуская опера стане менш беларускай, калі яе сцэна будзе адкрытая для ўсіх! «Нацыянальнай» оперы, у традыцыйным сэнсе слова, няма нідзе ў свеце. Сезон у La Scala адкрыўся французскай операй «Кармэн», галоўную ролю выконвала грузінка Аніта Рачвелішвілі, Хасэ — зорны нямецкі тэнар Ёнас Каўфман, Эскамільё — уругвайскі бас Эрвін Шрот, дырыжыраваў аргенцінска-ізраільскі маэстра Даніэль Барэнбойм. Лепшай «Кармэн» няма нідзе ў свеце.

Каб дамагчыся такога выніку, трэба спецыялісты. Высокапрафесійны дырыжор — магчыма, з тых, хто ў ранейшыя гады быў бяздумна і бязлітасна выгнаны з тэатра. А яшчэ болей — талковы менеджар, які б не займаўся пастаноўкамі, а вызначаў рэпертуарную палітыку тэатра і запрашаў людзей. Такія менеджары ёсць цяпер ва ўсіх сур'ёзных тэатрах. Гэта людзі «непублічныя»; мала хто ведае іх у твар. Але менавіта яны, а не дырыжоры і рэжысёры, вырашаюць, якую оперу ставіць і каго запрашаць на ролі.

Наш тэатр пакуль да гэтага не даспеў. Але перад ім трэба ставіць высокія мэты. Трэба, каб з артыстамі хтосьці займаўся, каб яны здолелі паспяхова канкураваць не толькі адно з адным, але прынамсі са спевакамі з суседніх краін. Трэба дамагацца, каб тэатр стаў цікавым і для публікі, і для патэнцыйных спонсараў, і — чым чорт не жартуе? — для дзяржавы, якая, на наш сорам, дагэтуль аддае перавагу «Славянскаму базару». Трэба аднаўляць сувязі з беларускімі артыстамі, якія блішчаць цяпер на найлепшых сцэнах свету, але адчуваюць боль і крыўду ад таго, што на радзіме іх не ацанілі і не прынялі. Будзе сумна, калі ў нас паставяць «Турандот», «Аіду» і «Тоску» без Ірыны Гардзей, а «Яўгенія Анегіна» — без Уладзіслава Сулімскага.

Хочацца верыць, што Міхаіл Панджавідзэ гэта разумее і дапаможа Оперы адысці ад правінцыйнасці, што ў нас спрабавалі зрабіць яшчэ ў 1980—90-я. Тады не ўдалося. Можа быць, удасца зараз?

## Беларускі дэсант у Канах

**Карціна Сяргея Лазніцы «Шчасце маё» не атрымала ўзнагародаў у Канах. Але ніколі раней беларуская прысутнасць на гэтых кінаагледзінах не была такой значнай.**

Сам Сяргей Лазніца — ураджэнец Баранавічаў, вучыўся ў Кіеве і Маскве, здымаў стужкі ў Расіі, а цяпер жыве ў Нямеччыне. Галоўную ролю ў ягоным фільме сыграў актор мінскага Тэатра юнага гледача Віктар Немец, а гукааператарам быў беларускі творца Уладзімір Галаўніцкі. Лазніца — сябар рэжысёра Віктара Аслюка, на мінскай кватэры якога Лазніца мантаваў некаторыя свае дакументальныя стужкі.

Лазніца марыў экранізаваць быкаўскую аповесць «У тумане», але ніхто не хацеў даваць на яе грошы. Першая ігравая стужка Лазніцы «Шчасце маё» пастаўленая рэжысёрам па ўласным сцэнары.

Гэта метафізічна-змрочны ігравы фільм пра кіроўцу, які збіўся з дарогі ў расійскай правінцыі і, сутыкаючыся з тутэйшымі, заглыбляецца ў сэрца зла. Фільм пастаўлены ва Украіне, на украінскія і нямецкія грошы. Шакаваная канская публіка ўспрыняла стужку як фільм жахаў, але Лазніца адштурхоўваўся ад рэальных гісторый, якія чуў, калі здымаў свае дакументальныя фільмы.

Інтрыгай Канскага фэсту было сутыкненне фільма Лазніцы з карцінаю Міхалкова «Стомленыя сонцам — 2». Калі б Лазніцу ўзнагародзілі, гэта выклікала б дзікі скандал. Як напісаў у інтэрнэт-дзённіку кінакрытык Сяргей Кудраўцаў, «фільм «Шчасце маё», які меў добрыя водгукі ў выданнях розных краінаў, пацярпеў ад нежадання бачыць Каны разбамбаванымі ў выніку пачатку самай вялікай з войнаў — міхалкоўскай».

Старшыня журы Цім Бёртан, ужо запрошаны Міхалковым у Маскву, тактоўна ўхіліўся ад палітычнага выбару, паліткарэктна ўзнагародзіўшы «Залатой галінай» тайскага рэжысёра Апічатпонга Вірасетакула за фільм «Дзядзька Бунмэ, які памятае свае былыя жыцці». Француз Маце Амальрык атрымаў прыз як найлепшы рэжысёр з карцінаю «Гастролі». Жульет Бінош і Хаўер Бардэм былі ўзнагароджаныя як найлепшыя акторы — у фільмах Абаса К'ярастамі і Алехандра Гансалеса Іньярыту.

Карціна пра беларускіх эмігрантаў у Бельгіі «Нелегал» Аліўе Масэ-Дэпаса, прадстаўленая ў двухтыднёвіку рэжысёраў, была адзначаная адмысловым прызам кампазітараў.

**Андрэй Расінскі**

Артыкулы на старонцы «Каментары» могуць супадаць, а могуць і не супадаць з меркаваннем Рэдакцыі.

# Някляеў: Чаму гаварыць праўду за расійскія грошы — кепска?

**Пасля трох сутак арышту 21 мая з ізалятара часовага ўтрымання былі вызваленыя лідэр кампаніі «Гавары праўду» Уладзімір Някляеў, а таксама ягоныя паплечнікі — галоўны рэдактар посткамуністычнай газеты «Товарищ» Сяргей Вазняк і міжнародны сакратар АГП Андрэй Дзмітрыеў.**




ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Прэс-канферэнцыя лідэраў «Гавары праўду» ў часе, калі Някляеў, Дзмітрыеў і Вазняк сядзелі ў ізалятары. Злева направа: палітолаг Святлана Навумава, паліттэхнолаг Аляксандр Фядута, журналіст Аляксандр Уліцёнак, грамадская дзяячка Таццяна Працька, лідэр посткамуністаў Сяргей Калякін.**

### 65 ператрусаў у 20 гарадах

Усе яны адбылі трое сутак у ізалятары як падазраваныя па крымінальнай справе па артыкуле 250 «Распаўсюд ілжывай інфармацыі аб таварах і паслугах». Увогуле крымінальная справа была заведзеная супраць кіраўніцтва прыватнай друкарні «Дзіксэнд», дзе нібыта вырабляліся паштоўкі «Гавары праўду». Някляеў і Вазняк жа выступалі як замоўцы. А на паштоўках, кажа абвінавачанне, былі ілжывыя выходныя звесткі.

Агулам жа 18 мая міліцыя і спецслужбы правялі рэкордную аперацыю.Ператрусы прайшлі ў 65 чалавек у 20 гарадах краіны. Амаль ва ўсіх канфіскавалі кампутары, флэшкі, іншую тэхніку. Паводле словаў Уладзіміра Някляева, у выніку прынамсі тры раённыя арганізацыі выйшлі з кампаніі.

«Затрыманым не казалі, што ім інкрымінуюць. Частка людзей напалоханая», — кажа праваабаронца Таццяна Працька.

### Арыштаваны Мікіта Матусевіч

У паведамленні Міністэрства ўнутраных справаў праператрусы ў актывістаў кампаніі «Гавары праўду» адзначалася, што падчас вобшукаў былі канфіскаваныя 2 адзінкі агнястрэльнай зброі, 39 патронаў, 6 адзінак халоднай зброі, а таксама наркатычныя рэчывы.

Уладзімір Някляеў казаў, што падчасператрусу ў яго дома міліцыянт хацеў запісаць, што канфіскаваныя патроны. «Добра, што панятым аказаўся мой сусед, які пачаў абурацца і казаць, што гэта будаўнічыя патроны. Мне здаецца, што яны хочуць зляпіць другую справу Аўтуховіча», — кажа паэт.

Тым не менш, інфармацыя пра зброю і наркотыкі ўсё ж пацвердзілася. За кратамі цяпер знаходзіцца Мікіта Матусевіч, сын былой лідэркі партыі жанчын «Надзея» Валянціны Матусевіч.

Маці арыштаванага даказвае, што нажы збіраў яе нябожчыкмуж, а патроны ў кватэры засталіся ад бабулі, якая была дацэнтам кафедры крыміналістыкі БДУ. Што датычыць наркотыкаў, то Матусевіч сказала, што гэтую траву ёй дала суседка, каб жанчына запарвала ў ёй ногі, калі стоміцца.

Матусевіч аказалася ў кампаніі «Гавары праўду» разам з экскамуністам Калякіным і актывам былой Партыі працы Бухвостава, якія складалі нефармальны Саюз левых сілаў.

### «Навошта Маскве падтрымліваць беларускага паэта?»

Вакол кампаніі ад пачатку хадзілі чуткі, што фінансуецца яна з Масквы. І чым больш часу праходзіла з моманту яе абвяшчэння, тым меней было яснасці. «Гавары праўду» зняла шматлікія офісы і мела сродкі для аплаты дзейнасці рэгіянальных актывістаў.

На прэзентацыі «Гавары праўду» Някляеў казаў, што гэта грошы беларусаў, якія былі вымушаныя з'ехаць у Расію, але зацікаўленыя ў змяненні палітычнага ладу ў краіне. У кулуарах хадзілі чуткі пра былога кіраўніка справамі прэзідэнта Івана Ціцянкова.

**Фядута: Някляеў не ўзяў бы грошай ад ворагаў Беларусі.**

Удзельніца кампаніі палітолаг Святлана Навумава кажа: «Улада павяла сябе не як улада, а як базарная баба, якая слухае гэтыя плёткі. Гэты палітычны пагром ёсць высокай ацэнкай «Гавары праўду». Спн. Навумава працавала на адзінага кандыдата ў прэзідэнты ад апазіцыі Уладзіміра Ганчарыка ў 2001 годзе.

Паліттэхнолаг Аляксандр Фядута разгром ацэньвае як спробу размовы ўладаў з Захадам, але «цяпер Захад не паддасца на такі шантаж». Што да грошай, то «Някляеў не ўзяў бы грошай ад ворагаў Беларусі», заявіў Фядута. «Калі спадар Някляеў вырашыць вылучацца [у прэзідэнты], я пайду за ім», — заявіў Фядута, адказваючы на пытанні чытачоў сайта радыё «Свабода».

«Тут дзеянні ўладаў і іншага боку супадаюць цалкам. Яны да-



ЗМІЦЕР ПАНКАВЕЦ

**Някляеў з жонкай на выхадзе з турмы.**

# Жонка Някляева маладзейшая за яго дачку

**Затрыманне лідэра грамадскай кампаніі «Гавары праўду» Уладзіміра Някляева вывела на публіку ягоную жонку Вольгу.**

Маладая жонка чакала паэта каля Ленінскага РУУСа, калі мужа дапытвалі. Сустракала яго на Акрэсціна пасля трохсуткавага зняволення. Пацалаваўшы яе, нягалены Някляеў з цеплынёй расказаў, што перададзеныя ёй у камеру катлеты «моцна ўзнялі ягоны аўтарытэт сярод сукамернікаў».

Уладзімір Някляеў пазнаёміўся з Вольгай падчас працы ў часопісе «Крыніца», якую паэт рэдагаваў. Маладая выпускніца ўніверсітэта працавала тады ў тэхнічным аддзеле часопіса. Пасля таго як «Крыніцу» закрылі, яны пабраліся шлюбам.

Вольга — другая жонка Уладзіміра Някляева.

З першай, Людмілай, паэт развёўся пасля трыццаці пяці гадоў сумеснага жыцця. Ад таго шлюбу засталіся дзве дачкі — Ілона (няродная) і Ева. Затым была яшчэ маладая жанчына Наталля, з якой паэт жыў разам, не распісаўшыся. Розніца ва ўзросце паміж Вольгай і Уладзімірам — 30 гадоў.

Жонка маладзейшая за дачку паэта Ілону і старэйшая за Еву. Сваіх дзяцей у іх няма.

**Кастусь Матушыч**

водзяць гэтую тэзу, што Някляеў атрымлівае грошы з Крамля, што ён агент. Скажыце, навошта Маскве падтрымліваць беларускага паэта?» — кажа сам Уладзімір Някляеў.

Ён называе правакацыямі такія чуткі, хоць яны для яго і чаканыя. «Падчас гэтыхператрусаў спецслужбы шукалі расійскі след сярод сваіх, сярод людзей ва ўрадзе, у Адміністрацыі прэзідэнта. Думалі, што нехта з чыноўнікаў таксама можа быць у гэтым замяшаны. Яны пачалі баяцца самі сябе», — працягвае паэт.

Тым не менш, Някляеў пакідае магчымасць для розных варыянтаў. «Дапусцім, што гэтыя грошы ў нас ёсць. Скажыце, чаму гаварыць праўду за расійскія грошы кепска, а займацца міжкандыдацкімі разборкамі за еўрапейскія — добра?» — задаўся рытарычным пытаннем лідэр кампаніі.

### «Кандыдатам ад «Гавары праўду» можа стаць Грушавы ці Процька»

Адразу па вызваленні з СІЗА Уладзімір Някляеў сказаў, што чакаў такіх рэпрэсій з боку ўлады, але пасля таго, як будзе абвешчана пра ўдзел у прэзідэнцкіх выбарах.

«Ператрусамі ўлады паставілі нас у палітычнае поле. У пачатку кампаніі не мелася на ўвазе, што нехта ад «Гавары праўду» абавязкова пойдзе на прэзідэнцкія выбары. Калі на выбары пойдуць дзесяць чалавек, калі не будзе адзінства, то мы будзем змушаныя вылучыць свайго кандыдата — хай гэта будзе Генадзь Грушавы ці Таццяна Процька. Мы заклапочаныя не адсутнасцю адзінага кандыдата, а адзінствам», — зазначыў Някляеў.

Варта адзначыць, што на кампанію «Гавары праўду» працуе большасць партыйнага актыву Аб'яднанай грамадзянскай партыі і Партыі левых «Справядлівы свет». Гэта тыя самыя сілы, што гуртаваліся і ў межах заснулай кааліцыі «Аб'яднаныя дэмакратычныя сілы».

Лідэр «Справядлівага свету» Сяргей Калякін сказаў, што партыя ўспрымае «Гавары праўду» як карысную ініцыятыву. Сябрам партыі было рэкамендавана актыўна ўключыцца ў працу кампаніі. Тое самае датычыць і АГП.Ператрусы ў актывістаў кампаніі Калякін назваў «разбоем і фашызмам».

**Зміцер Панкавец**

# Топ-10 беларусаў-эмігрантаў у Расіі

**«Гэта грошы беларусаў, якія былі вымушаныя з'ехаць у Расію, але зацікаўленыя ў змяненні палітычнага ладу ў краіне». Так на стартавай прэс–канферэнцыі Уладзімір Някляеў патлумачыў паходжанне сродкаў на правядзенне кампаніі «Гавары праўду». Хто ж з беларусаў у Расіі займае ўплывовыя ці высокія пасады?**



**1.** Паспяховы бізнес у Расіі мае **Віктар Лагвінец**. У першыя гады кіравання Лукашэнкі ён быў блізкі да кіраўніка краіны праз ягоны тагачасны кашэль — Івана Ціцянкова. Валодаў кампаніяй «Конта-груп», пакуль не раскулачылі. Тады ўцёк у Расію. У 2004 годзе маёмасць, якой валодаў Лагвінец, ацэньвалася ў 175 млн даляраў. За 6 гадоў маёмасць былога генеральнага дырэктара «Калмнафты» (Калмыкія) магла ўзрасці.

Хадзілі чуткі, што Лагвінец мог фінансаваць мінулую прэзідэнцкую кампанію Аляксандра Казуліна, — проста каб насаліць свайму былому патрону. Праўда, ніякіх пацверджанняў гэтаму не было.

Цікава, што Лагвінец — родны дзядзька Алеся Лагвінца, памочніка Мілінкевіча. Праўда, іх жыццёвыя дарогі даўно разышліся, і ніякіх сувязяў яны не падтрымліваюць.

**2.** Федэральнай нацыянальнай культурнай аўтаноміяй «Беларусы Расіі» кіруе **Валерый Казакоў (на фота)**. Ён чыноўнік, які мае ўваходы ў Адміністрацыю прэзідэнта Расіі, памочнік паўнамоцнага прадстаўніка прэзідэнта Расіі ў Сібірскай федэральнай акрузе. Казакоў доўгія гады кіруе прадстаўніцтвам Сібірскай федэральнай акругі ў Маскве. Народжаны ў Беларусі, ён зрабіў кар'еру ў Савецкай Арміі. Кандыдат сацыялагічных навук, палкоўнік у адстаўцы, у постсавецкі час працаваў у Радзе бяспекі Расіі і Адміністрацыі прэзідэнта. Ён адзін з нямногіх беларусаў Расіі, які свабодна гаворыць па-беларуску і бярэ ўдзел у дзейнасці Згуртавання беларусаў свету «Бацькаўшчына». На IV з'ездзе Федэральнай нацыянальнай культурнай аўтаноміі «Беларусы Расіі», які прайшоў 23 красавіка, стала вядома, што беларусы Расіі ініцыюююць стварэнне Беларускага незалежнага інстытута ў Маскве. Што гэта будзе за інстытут, пакуль няясна.

**3.** Былы кіраўнік справамі прэзідэнта **Іван Ціцянкоў** у свой час падмяў пад сябе вялікі бізнес у Беларусі, але, са словаў Лукашэнкі, «зарваўся». Быў адпраўлены ў адстаўку. Уцёк у Маскву, а пасля праклаў туды дарогу многім беларускім высокапастаўленым эмігрантам. У 2000 годзе ён заняў пасаду начальніка ўпраўлення лагістыкі ў канцэрне «Ітэра», даччынай структуры «Газпрома». У 2001 годзе Ціцянкова звязвалі з кампаніяй Уладзіміра Ганчарыка. Жонка Ціцянкова нават надрукавала адкрыты ліст Лукашэнку, у якім хрыстом-богам маліла не чапаць сына — ён, маўляў, за бацьку не адказны.

У «Ітэры» Ціцянкоў адрабіў год, а пасля стаў развіваць уласны бізнес.

**4.** Пасля выхаду з турмы на два дамы — пад Мінскам і ў Маскве — жыве былы міністр сельскай гаспадаркі **Васіль Лявонаў**. Ён развівае сельскагаспадарчы бізнес у расійскім Чарназем'і. Менавіта ён арганізаваў выбарчую кампанію Ганчарыка ў 2001 годзе. Пэўную палітычную актыўнасць праяўляў да года 2004-га. Цяпер жа пакуль трымаецца ў цені, але застаецца старшынём апякунскае рады беларуска-расійскага фонда «За новую Беларусь».

**5.** Былы міністр унутраных справаў **Уладзімір Навумаў** ведае ўсё пра гучныя справы. Ягонае імя фігуравала ў дакладзе Пургурыдэса аб зніклых палітыках і бізнесоўцах. Паводле некаторых звестак, ад пачатку гэтага года Навумаў працуе на пасадзе дарадцы Сяргея Чэмезава, генеральнага дырэктара дзяржаўнай карпарацыі «Растэхналогіі». Гэтая структура знаходзіцца пад асабістым кантролем Уладзіміра Пуціна. Як ураджэнец Смаленшчыны Навумаў не мае права балатавацца ў прэзідэнты Беларусі. Аднак ён добра ведае і Лукашэнку, і ўсіх высокіх чыноўнікаў.

**6. Уладзімір Муляк** з 1996 да 2001 года працаваў на адказнай пасадзе ў «Беларуснафце». Пасля свайго вымушанага ад'езду з Беларусі ён адразу знайшоў працу ў ААТ «НК Комі ТЭК». Цяпер жа Муляк — сябар праўлення і віцэ-прэзідэнт магутнай нафтавай кампаніі «Лукойл». Ён начальнік галоўнага ўпраўлення па забяспечанні здабычы нафты і газу. «Лукойл» мае свае інтарэсы ў Беларусі. У пуцінскай Расіі прыватны «Лукойл» заняў пачэснае месца сярод дзяржаўных карпарацый.

Былы генеральны дырэктар «Беларуснафты» Валерый Кокараў у 1990-х працаваў віцэ-прэм'ерам па паліўна-энергетычным комплексе. Цяпер ён таксама працуе ў структуры «Лукойла», але на менш уплывовай пасадзе намесніка генеральнага дырэктара па навуцы і інавацыйнай дзейнасці ААТ «РІТЭК».

**7.** Былы кіраўнік Адміністрацыі прэзідэнта, а да таго — кадэбіст **Урал Латыпаў** пасля адстаўкі тры гады адпрацаваў старшынём кансультацыйнае рады кампаніі «Лукойл-Беларусь». З 2008 года Урал Латыпаў узначаліў ТАА «Дырэкт Менеджмент» — кіраўнічую структуру ААТ «МТЗ «Рубін», аднаго з найбуйнейшых дэвелапераў расійскай сталіцы, які належыць выхадцу з Мінска Аляксандру Міляўскаму. У той жа кампаніі пэўны час працаваў былы прэм'ер-міністр Беларусі (да 2001 года) Уладзімір Ярмошын. Цяпер у ёй жа працуе былы галоўны архітэктар Мінска Аляксандр Чадовіч. Ён займае высокую пасаду віцэ-прэзідэнта ААТ МТЗ «Рубін» па архітэктуры.

**8. Леанід Ерын**, які кіраваў беларускім КДБ да 2004 года, знайшоў сябе ў буйной расійскай дзяржкарпарацыі. Ён займае пасаду дарадцы пры прэзідэнце ААТ «Расійская чыгунка» Уладзіміру Якуніну. Масква яму не чужая. Ён там працаваў у ФСБ перад сваім пераездам у Беларусь, дзе яго адразу прыгрэў Лукашэнка. А ў Мінск Ерын даволі часта лётае ў адведкі.

**9.** У Маскве знайшоў працу папярэднік Ерына на пасадзе старшыні КДБ **Уладзімір Мацкевіч**. Цікава, што па першай спецыяльнасці ён займаўся «хімічнай тэхналогіяй перапрацоўкі нафты і газу». У 1970—1973 гадах працаваў інжынерам-тэхнолагам на Мазырскім нафтаперапрацоўчым заводзе. А тады ўжо пайшоў у савецкую спецслужбу. У адстаўку Мацкевіч быў адпраўлены пасля таго, як следчыя КДБ пачалі расследаваць справу аб палітычных выкраданнях. 8 гадоў Мацкевіч узначальваў беларускую дыпмісію ў Бялградзе. І ні слова не сказаў адносна тых гучных справаў. У свой час ён перанёс рак, аперавалі яго ў Нямеччыне, ён дагэтуль назіраецца ў дактароў і актыўнай дзейнасцю не займаецца.

**10.** Па сваёй «першай спецыяльнасці» ўладкаваўся ў Маскве былы ўсёмагутны начальнік Беларускай чыгункі **Віктар Рахманько**. У Беларусі ён страціў сваю пасаду праз карупцыйную справу ў 2001 годзе. Рахманько даўно займае адказную пасаду ў «Газпроме». Ён — начальнік упраўлення транспарту Дэпартамента інвестыцыяў і будаўніцтва.

**Мікола Бугай**

**Удзячнасць за звесткі — сайту «Заўтра тваёй краіны»**

**Асобы з дзяржаўных структур або набліжаных да Пуціна кампаній**

Валерый Казакоў
Уладзімір Навумаў
Уладзімір Муляк
Аляксандр Міляўскі
Урал Латыпаў
Леанід Ерын
Віктар Рахманько

**Уласнікі самастойных бізнесаў**

Віктар Лагвінец
Васіль Лявонаў
Іван Ціцянкоў

КАМЕНТАР

# Навука Таргавіцы

**Уладзімір Някляеў рытарычна запытаўся, «чаму кепска гаварыць праўду за расійскія грошы». Беларуская гісторыя мае адказ на гэтае пытанне. Піша Сяргей Богдан.**

Справа была ў другой палове XVIII ст. Тагачасная Рэч Паспалітая выглядала не сімпатычнейшай за сённяшні крэольскі рэжым. Эканамічна краіна занепадала пад уладай нікчэмнага караля. А культурнаператваралася з талерантнай Дзяржавы Абодвух Народаў у дзяржаву для каталікоў, дзе месца іншаверцам заставалася ўсё менш.

Ахвотных змяніць сітуацыю і ўрад не бракавала, у тым ліку сярод шляхты Вялікага Княства. Іх крыўдамі не прамінула скарыстацца і Расія, якая чынна дапамагла шляхецкім канфедэрацыям, што супрацьстаялі прадажнаму каралеўскаму ўраду, — спачатку Слуцкай, пазней Таргавіцкай. Рабілі тое расійскія ўладары не за «дзякуй», а каб дасягнуць сваіх зусім не альтруістычных мэтаў.

Канфедэратаў цяжка назваць здраднікамі. Яны нацярпеліся крыўдаў ад сваёй дзяржавы, ім абрыдла няспынная дэградацыя навокал. Хаця сярод іх сапраўды маглі быць людзі, прагныя да расійскіх грошай і абыякавыя да Бацькаўшчыны, няма ніякага сумневу, што былі і сумленныя патрыёты. Расійскія грошы нічога не далі б, калі б не мноства сумленных, але пакрыўджаных грамадзянаў.

Канфедэраты фактычна выканалі расійскую імперскую праграму, з сапраўды добрымі намерамі і лозунгамі — раўнапраўе, пераадоленне анархіі — але ў выніку край апынуўся ў руках драпежных суседзяў.

Наступствы вядомыя — тры падзелы беларуска-польскай дзяржавы. На змену нягегламу каралю Панятоўскаму прыйшла магутная Кацярына II, на змену анархіі — дэспатыя і імперскі парадак.

Хоць сёння магло б быць наадварот, навука для сучаснасці — відавочная. Бессэнсоўна зводзіць гаворку пра руку Масквы на найбліжэйшых выбарах толькі да пытання «здрады». У краіне шмат праблемаў і скрыўджаных людзей, і Расія можа лёгка напаліць сітуацыю, укінуўшы свае грошы і скарыстаўшыся сваімі сувязямі, — спецслужбы Беларусі і Расіі дагэтуль злучаныя мноствам нябачных шчыльных асабістых сувязяў паміж саслужыўцамі і калегамі.

Пра гэтыя акалічнасці нельга забывацца. Нельга падтрымліваць першага-лепшага апанента Лукашэнкі толькі таму, што той выступае супраць Лукашэнкі. Важна не тое, супраць каго/чаго нехта выступае, важна, за што/каго змагаецца. Таму змагацца супраць Лукашэнкі на расійскія грошы — праводзячы аб'ектыўна расійскія інтарэсы — шлях аблудны, з аднае пасткі ў другую.

Што ж пагражае Беларусі, калі «расійская партыя» выйграе? Наўрад ці паглынанне Расіяй, бо тая не мае патрэбы ва ўсталяванні наўпростага адміністрацыйнага кантролю. Гэта задорага для Масквы, для здзяйснення сваіх мэтаў яна мае больш эфектыўныя сродкі. Пагражае ж, у прыватнасці, эканамічная экспансія, падтрыманая адміністрацыйным рэсурсам больш лаяльных да Масквы (чым Лукашэнка) беларускіх элітаў. Гэта не будзе прыход інвестараў і новых гаспадароў, гэта будзе тое, што ў маскоўскіх фінансавых колах называюць ёмістым расійскім словам «дерибан».

Вядома, тое самае пагражае Беларусі і пры далейшым кіраванні цяперашняга рэжыму. Аднак гэтаму рэжыму беларускія контрэліты здолелі арганізаваць працяглы адпор. У выніку чаго яго выжывальнасць залежыць ад папулярнасці, і ён вымушаны лічыцца з грамадскай думкай.

Нельга адмыкаць дзверы «дабрадзеям» з-за ўсходняй мяжы, якія цынічна злоўжываюць самаахвярным грамадзянскім уздымам супраць дэспатыі. Прыклад таргавіцкіх канфедэратаў тут паказальны. *Nil novi sub luna...*



# Ад родных сядзіб на вуліцу 7 Лістапада

**Цэнтр Ліды рыхтуюць да Дажынак, людзей высяляюць з дамоў.**

Ліда сустракае нас залевай і перакапанымі дарогамі. Горад перажывае грандыёзныя змены: стаянка для аўтобусаў стаіць без асфальту, аўтавакзал перабудоўваецца, чыгуначны — без даху, побач расце новы пешаходны мост.

«Жах нейкі, вось што я думаю, — дзеліцца ўражаннямі жыхарка Ліды. — Разрылі горад, але ніякай працы няма. Мы ўжо даўно скачам па гэтых лужынах. А будаўнікі то у карты гуляюць, то кураць... Нам расказвалі, як было ў Кобрыне пасля Дажынак. Там таксама хутка-хутка нарабілі, а праз год усё пааблазіла».

«Пацерпім, затое потым будзе прыгожа», — усміхаюцца аптымісты.

Лідскія дажынкі запланаваныя на верасень. На падрыхтоўку горада да свята засталося крыху больш за тры месяцы. Рабочыя карчуюць маладзенькія таполі каля друкарні ды кладуць пад дажджом новы асфальт . Але Ліду чакаюць не толькі касметычныя змены. У раёне Дома культуры на тым тыдні знікла цэлая вуліца: людзей перасялілі, а іх старыя драўляныя дамы — спалілі. У цэнтры горада адну за адной высяляюць прыватныя хаты. На іх месцы паўстане новы сквер з фантанам.

## Высяленні: два бакі медаля

«Людзі жывуць у цяжкіх умовах: падлога дрэнная, столь падае. Уся хата трымаецца на аконных рамах. Калі мянялі гэтыя рамы, то будаўнікі стаялі і трымалі хату, каб не развалілася. А што вы хочаце: хата з 1923 года, і ніколі не рабілася капрамонту, — расказвае мясцовы жыхар, мастак Пятро Цімафееў.

Ягонае жытло стаіць у цэнтры Ліды, на вуліцы Перамогі. Раней, пры Польшчы, у доме мастака жылі габрэі, пры савецкай уладзе тут была нейкая кантора, а потым дом пабілі на кватэры. Пятро Цімафееў узгадвае, што ў пачатку 1990-х, калі выдавалі купоны на дэфіцыты, ён і яго суседзі не маглі іх атрымаць: іх дамоў ужо афіцыйна не існавала на плане горада.

З тых часоў мінула два дзесяткі гадоў. Але толькі цяпер у жыхароў прыватнага сектару з'явіўся шанец атрымаць кватэру. Здавалася б, Дажынкі тут дарэчы. Аднак у медаля ёсць і адваротны бок.

Шматкватэрны дом, у які павінны перасяліць жыхароў гэтай часткі лідскага прыватнага сектару, дагэтуль не гатовы. Новабудоўлю можна пабачыць з вокнаў старых хацінак: праца не спыняецца нават у дождж. На ўзроўні пятага паверха яшчэ толькі кладуць пліты, а на першым ужо пачынаюць шкліць вокны. Дом мусяць здаць да 1 жніўня. Усім, хто чакае на новыя кватэры, даводзіцца сядзець «на валізках» ці перасяляцца ў жыллё падменнага фонду. Аднак людзі ў падменны фонд пераязджаць не спяшаюцца: па-першае, не хочуць жыць у інтэрнатах, па-другое, баяцца, што часовае жыллё можа ператварыцца ў сталае.

«Я жыву тут з 1978 года, — расказвае жыхарка прыватнага сектара Ірына Малец. — Ясна, жыць складана: дрэва гнілое, хочацца ўжо кватэру, але вось гэты падменны фонд — вось у чым бяда. Нам прапанавалі інтэрнат. Пайшла дачка паглядзець, дык там страх, што робіцца. Там бруд! Мой унук сказаў: «Я туды не пайду». Вось сядзім пакуль, чакаем. Прапаноўвалі нам яшчэ адзін варыянт: у інтэрнатах на вуліцы Рыбіноўскага. Аднак дачка не згодная, тут тыдзень застаўся да канца заняткаў, а унук мой у першым класе вучыцца. І з Рыбіноўскага ніяк не ўдасца вазіць яго ў школу. Дачцэ а 8-й трэба на працу, дык трэба паспець завесці ўнука ў мікраraён Расляні на другі канец горада ў школу, а потым бягом на працу. А я хворая, у мяне другая група, я не магу ёй дапамагчы».

Гаспадыня шчыра шкадуе стары дом мужа, аднак прызнаецца, што надакучыла жыць у цэнтры горада і пры гэтым насіць з калонкі ваду, паліць у печы, мерзнуць узімку. Хочацца, нарэшце, сваю кватэру. За ростам новабудоўлі спадарыня Ірына сочыць штодзень. Аднак перажывае з-за яшчэ адной акалічнасці: на чатырох жыхароў са старога дома абяцаюць толькі двухпакаёвую кватэру. «Самі разумееце, вялікага пакоя ніяк не выйдзе», — уздыхае гаспадыня. Прыйдзецца неяк прыдумляць, як падзяліць новыя 64 метры на сябе, дачку з мужам і ўнукам. Аднак выбару няма. Жыхары маленькай хаткі ў цэнтры Ліды спрабуюць радавацца таму, што маюць, і збіраюць рэчы.

## Замест хатаў ля замка — возера

Калі ў цэнтры Ліды людзі даўно чакалі перасяленняў са старых хатаў, то для жыхароў вуліцы Замкавая Дажынкі прыйшлі нечакана. Літаральна пад вежамі замка стаіць прыгожая вулачка дыхтоўных прыватных дамоў з садамі, гародамі і гаражамі. Якім жа было здзіўленне іх жыхароў, калі яны пабачылі новы генплан Ліды. На месцы іх дамоў было намаляванае новае возера і зона адпачынку.

Жыхарам гэтага куточка старога гораду таксама прапанавалі пажыць у сяброў ці перабрацца ў падменны фонд. А на рукі выдалі толькі рашэнне Лідскага райвыканкама, у якім пазначана, што зямля адабраная для дзяржаўных патрэбаў і горад дае гарантыю, што прадставіць жыллё ў шматкватэрным доме па вуліцы 7 Лістапада. Відавочна, аднак, што гэта прывядзе да пагаршэння жылёвых умоваў і стратаў: як ні круці, а жыхары вуліцы каля замку згубяць каштоўную зямлю ў гістарычным цэнтры.

Аднак гаварыць з журналістамі пра сваю бяду жыхары вуліцы пабаяліся. «А раптам мяне пасадзяць на гадоў пяць ці кватэру не дадуць потым», — такі быў стандартны адказ.

Людзі маўчаць, пакуль у іх забіраюць хаты і зямлю.

**Настасся Шамрэй, фота аўтара**

### Першая ахвяра Дажынак у Лідзе

Васьмідзесяцігадовы пенсіянер раніцай 20 мая, як звычайна, адправіўся на лецішча. Аднак не прайшоў ён і дзесятка метраў ад хаты, як зваліўся ў траншэю, выкапаную для пракладкі кабеля. Пры падзенні сталы чалавек ударыўся галавой аб цэглу, што і стала прычынай яго смерці.

У некалькіх дамах па вуліцы Астроўскага ў Лідзе вядзецца капітальны рамонт. Побач з імі рэарганізуюць лінію электраперадач, якую вырашана схаваць у зямлю. Траншэю пад кабель вырылі зусім побач з пад'ездам, але ніякіх агароджаў не выставілі. Трагедыя адбылася а 6-й раніцы. У гэты час на вуліцы дастаткова светла. Аднак варта ўлічыць той фактар, што мужчыну было 80 гадоў. Зрок у яго быў далёка не ідэальны. Магчыма, фатальную ролю адыграла раскіданая вакол траншэі цэгла.

Цікава, што ў гэты ж дзень працоўныя вельмі хутка скончылі пракладку кабеля і за лічаныя гадзіны закапалі траншэю. Хаця ў суседніх дварах такія ж ямы так і засталіся без агароджы.

**НШ; паводле lifelida.com**

ДЗЕ ВАРТА БЫЦЬ

## Прэзентацыі кніг Андрэя Катлярчука ў Мінску, Віцебску, Магілёве, Гомелі і Баранавічах

1—4 чэрвеня гісторык Андрэй Катлярчук наведае беларускія гарады, каб прадставіць чытачам свае кнігі «Шведы ў гісторыі і культуры беларусаў» і «У цені Польшчы і Расіі. Вялікае Княства Літоўскае і Швецыя ў часе еўрапейскага крызісу сярэдзіны XVII ст.».

1 чэрвеня а 16.00 прэзентацыя з удзелам аўтара адбудзецца ў канферэнц-зале Нацыянальнай бібліятэкі (Мінск, пр.Незалежнасці, 116).

2 чэрвеня а 18.00 Андрэй Катлярчук спаткаецца з чытачамі ў Віцебску, у Духоўнай вучэльні, па адрасе вул.Крылова, д.7 (недалёка ад Ратушы, каля музычнай школы, насупраць рэстарацыі «Залаты дракон»).

3 чэрвеня а 17.00 Катлярчук запрашае гасцей на сустрэчу ў Магілёве (абласная бібліятэка, вул. Крыленкі, 8), а 20.00 у Гомелі (вул.Палеская 52).

4 чэрвеня а 19.30 з аўтарам можна будзе сустрэцца ў Баранавічах (вул. Міцкевіча, 65).

Запрашаюцца ўсе ахвочыя.

**У аэрапорце? У машыне? У метро? Чытай pda.nn.by з мабільніка**

Трымайце руку на пульсе pda.nn.by, дзе б Вы ні былі.

nn.by штодзённа забяспечвае аператыўныя і аб'ектыўныя навіны, ясныя каментары і аналітыку, аўтарскае відэа і фота. Усім гэтым Вы можаце карыстацца з мабільнага тэлефона. Праз ПДА-версію Вы можаце сачыць за навінамі і каментарамі, ашчаджаючы трафік. Яна зручная і сціслая.

# Блокбастэр-мокбастэр

**На экраны выйдзе «Тытанік: Працяг». Ды Капрыё і Кейт Уінслет зноў разам? О не: гутарка вядзецца пра «мокбастэр».**

## Місія — выканальная

...Група ваяроў, што змагаецца за волю супраць бяздушных кібаргаў з чырвонымі лямпачкамі-вачмі, якія калісь былі распрацаваныя, каб служыць чалавечаму роду, але паўсталі супраць яго...

Гучыць знаёма? Не, гутарка не ідзе пра стужку з серыі «Тэрмінатар», а пра мокбастэр (анг. mockbuster, «стужка-перапеўка», «стужка-фальшыўка») «Тэрмінатары». Адна збытная літара, але якая розніца: кіно з сярэднімі акторамі, нацягнутым сюжэтам, таннымі спецэфектамі і бездапаможнымі дыялогамі. Гэтыя стужкі выходзяць адразу на DVD, мінаючы шырокаэкранны пракат.

«Тэрмінатары» не адны такія. «Скарбы Да Вінчы», «Трансморферы», « Змеі на цягніку» — усе яны з кінабагажа кінакампаніі The Asylum апошніх пяці гадоў. Іх місія — зарабіць на падабенстве.

## У промнях чужой славы

Мокбастэры вядуць свой радавод з канца 60-х, калі пачаліся падрабляцца мульфільмы «Дыснэя». Цяперашнія ж «каралі мокбастэраў», каліфарнійская кампанія The Asylum, заснаваная ў сярэдзіне 90-х гадоў, натрапілі на гэтую жылу амаль выпадкова. У пачатку свайго шляху The Asylum прадавала танныя жахалкі, потым пачала здымаць фільмы. У 2005 годзе каліфарнійцы захацелі зняць рымэйк фільма 1953 г. «Вайна светаў», але грошай, каб зрабіць паўнакроўную перапеўку, не ставала. Тады іх распаўсюднікі, найвялікшая кампанія ў ЗША па гандлі DVD з фільмамі, «Блокбастэр», параілі ім рэкламны ход: зрабіць і выпусціць фільм адначасова са стужкай Стывена Спілберга, які таксама тады задумаў зняць рымэйк з Томам Крузам у галоўнай ролі.

Усё спрацавала як па нотах: мокбастэр фірмы The Asylum на хвалі папулярнасці аднайменнага блокбастэра Спілберга зрабіўся хітом.

## Adias, Adidos ды інш.

Потым быў змалпаваны «Кароль страчанага свету», які выйшаў паралельна з пітэрджэксанаўскім «Кінг Конгам» (2006). Продажы зноў скокнулі ў неба, кіраўнікі маленькай кінастудыі атрымалі мянушку «каралёў мокбастэраў». Тады канчаткова ўфармавалася бізнес-мадэль усяго прадпрыемства.

**1. Паралельны выхад мокбастэра з першапачатковай версіяй.**

Рэкламная кампанія дарагога блокбастэра спрыяе таму, што назва круціцца ў свядомасці масавага гледача. У дадатак, спажыўца яўна зацікавіць хуткі выхад на DVD. Падмену заўважае ладная колькасць спажыўцоў, але рука ўсё адно цягнецца па вокладку з нібыта знаёмымі назвамі. А можа, і не заўважаюць (прыгадаем поспех красовак Adias, Adidos ды іншых, якія калісь прадаваліся на беларускіх рэчавых рынках).

**2. Назва, якая нагадвае першапачатковы фільм.**

Ці не праўда «100 мільёнаў да н.э.» — ну копія «10000 да н.э.»? А «Алан Кватэрмэйн і храм чарапоў» адразу адсылае да «Індыяны Джонса і каралеўства крышталёвага чэрапа» ды «Індыяны Джонса і храма лёсу».

**3. Падобны сюжэт.**

Напрыклад, археолаг і авантурнік Алан Кватэрмэйн у каўбойцы і тэхаскім капелюшы нагадвае прафесара Індыяну Джонса.

**4. Схема амаль бяспройгрышная, бо грашовыя ўкладанні адносна невялікія.**

Нават калі «дарагі» блокбастэр, напрыклад, «Тэрмінатар-4: Хай прыйдзе Збаўца», непаспяховы ў пракаце, вярнуць назад невялікі (250-700 тыс. даляраў) бюджэт за «Тэрмінатараў» можна заўсёды.

Праўда, сеціва поўніцца скаргамі абураных кліентаў, якія пазычылі ў відэаматах другарадныя стужкі, думаючы, што ўзялі арыгінал. Кінамастацтва такія опусы дакладна не дасканаляць. Вялікія кінастудыі




таксама абураныя: час ад часу грозяцца падаць у суд, але як? Назвы фільмаў жа хоць і падобныя, але не ідэнтычныя, і ў дадатак сюжэт не заўсёды паўтараецца.

Адна карысць ад мокбастэраў: іх бізнес-схема дапамагае такім як фірмам, як Asylum, трымацца над вадою. Ну і гледачу — сяк-так прабавіць вечар.

«Мы маленькая кампанія: здымаем жахалкі, трымценнікі і калі трэба — мокбастэры. Мы робім тое, на чым можна зарабіць», — кажа дырэктар фірмы The Asylum Дэвід Леан.

І дарэчы, хто сказаў, што такія фільмы, як рымэйк Пітэра Джэксана «Кінг Конг» (які там ужо па ліку?), не праследуюць тыя самыя мэты?

## Беларускі след

У Беларусі ёсць свае мокбастэры.

Гэта прадукцыя паўаматарскай кінакампаніі Navinki Home Video: «Случай з пацаном», «Гудбай, бацька!», «Толькі мёртвыя нічога не баяцца». Умовы выкананыя: гэта нізкабюджэтныя або амаль безбюджэтныя стужкі. Назва, якая нагадвае вядомыя блокбастэры, плюс нацыянальная спецыфіка — перапеўкі савецкіх назваў: «Случай з пацаном» гучыць як сучасны працяг «Лёсу чалавека», а «Гудбай, бацька!» — як непрыхаваная алюзія на нямецкі фільм «Гудбай, Ленін!». Сюжэты ўтрымліваюць жанравыя клішэ баевікоў або фільмаў жахаў. Дарэчы, калі «Случай з пацаном» у 2001 г. трапіў на відэакасеты, яго пазіцыянавалі як годны адказ тэндэнцыйнаму расійскаму баевіку «Брат-2».

Не хаваюць таксама «навінкаўцы» і сваё жаданне зарабіць: «Случай з пацаном» быў выдадзены (тады яшчэ на відэакасетах) ажно з дзвюма версіямі вокладкі: для беларускага і расійскага рынку.

«Так, у назвах і сюжэтах мы выкарыстоўваем алюзіі, адсылкі да пэўных жанраў: жахалак, савецкага кіно, — кажа адзін з кіраўнікоў творчае суполкі Navinki Home Video Паўлюк Канавальчык. — Рэч у тым, што цалкам самастойны прадукт патрабуе шмат высілкаў. А так, называючы і ўстаўляючы нейкія сюжэтныя клішэ і робячы назву пазнавальнай, мы вырашаем шмат пытанняў, звязаных з прамоцыяй фільма».

Новы, заяўлены на 2010 год фільм ад Navinki Home Video — «Толькі мёртвыя нічога не баяцца»/Only Dead Are Afraid Nothing. Зноў традыцыйны набор хорар-банальнасцяў: зомбі і крывасмокі. У фільме задзейнічаныя вядомыя постаці культурнай прасторы: Адам Глобус і Валянцін Акудовіч, якія граюць ролю санітараў. Аднак у адрозненне ад галівудскіх жахалак, паказаная сучасная Беларусь з усімі яе супярэчнасцямі і канфліктамі. Даецца і сваё, камерцыйна-забаўляльнае бачанне беларускай палітычнай з'явы — выкрадання людзей.

«Мы, зразумела, толькі ўсцешымся, калі заробім на гэтым фільме, але прыбытковасць не ёсць нашай найпершай задачай, — дадае Паўлюк Канавальчык. — Калі выперадзім «Масакру» Кудзіненкі, дык наша мэта — атрымаць асалоду творцы і стварыць першы беларускі фільм жахаў».

**Ліза Кавальчык**

# «Апошнім часам хутка развіваецца беларусістычная паліталогія»

У Мінску прайшоў Міжнародны кангрэс беларусістаў. На яго сабралося больш за 170 удзельнікаў, з іх 99 — з Беларусі. Самая вялікія замежная дэлегацыя прыехала з Польшчы — трыццаць чалавек, з Германіі і Украіны — па адзінаццаць, з Літвы — дзевяць. Былі таксама прадстаўнікі з Чэхіі, Расіі, ЗША, Аўстрыі, Швейцарыі, Ізраіля, Вялікабрытаніі, Нарвегіі.

Сярод іх такія вядомыя даследчыкі, як Арнольд МакМілін (Вялікабрытанія), Адам Мальдзіс (Беларусь), Мікалай Нікалаеў (Расія), Юрась Гарбінскі (Польшча), Ніна Баршчэўская (Польшча), Герман Бідэр (Аўстрыя).

«Беларусістыка ў свеце найлепш развіваецца там, дзе ёсць адпаведныя кафедры, інстытуцыі, — кажа кіраўнік Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў Сяргей Запрудскі. — Напрыклад, можна назваць універсітэты ў Варшаве, Беластоку, Вільні. Успамінаецца прыклад Славістычнага інстытута ў Парыжы, які быў заснаваны яшчэ ў міжваенны час. Гэты інстытут узнік таму, што ўрады Чэхаславакіі і былой Югаславіі выдаткавалі на гэта грошы. Інстытут славянскіх даследаванняў у Парыжы існуе і сёння, і гэта стварае пэўныя ўмовы для існавання славістыкі ў Францыі.

Сярод беларусістаў пераважаюць літаратуразнаўцы, сацыёлагі, эканамісты, юрысты. Апошнім часам за мяжой хутка развіваецца беларусістычная паліталогія.

**Кастусь Матушыч**

## Сцісла

• **У Мінску з'явілася вуліца Еўфрасінні Полацкай.** Яна стала працягам вуліцы Пятра Глебкі ў межах вуліц Прытыцкага і Адоеўскага. Акурат там, дзе будуецца вялікі праваслаўны сабор. Апроч таго, гарсавет вярнуў вуліцы Гандлёвай старадаўнюю назву Зыбіцкая (вуліца ідзе па нізкім, абалонным месцы).

• **Увекавечыць месца бою паўстанцаў 1863 года хочуць на Вілейшчыне.** З такой прапановай у Міністэрства культуры звярнуўся старшыня Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры Антон Астаповіч. Гаворка пра ўскраек вёскі Каралеўцы. Тут, ва ўрочышчы Біты Лог, 5 чэрвеня 1863 года загінуў 31 паўстанец з атрада на чале з Густавам Чаховічам. У 2008 годзе ва ўрочышчы паўстаў памятны знак. Тое сталася дзякуючы краязнаўцу Анатолю Рогачу. У іншым месцы краязнаўца хацеў паставіць памятны знак сёлета. Але ў сакавіку сп. Рогач памёр.

• **Помнік кіраўніку «Манголкіно» ўсталююць у Полацку.** Бюст аўтара першага беларускага мастацкага кінафільма, палачаніна Юрыя Тарыча, паўстане насупраць адзінага полацкага кінатэатра «Радзіма». Урачыстая цырымонія адкрыцця адбудзецца 28 мая. Рэжысёр, актор і сцэнарыст Юрый Тарыч (1885—1967) меў цікавую біяграфію. Ён быў першым акторам, які на прафесійнай сцэне сыграў Леніна. У 1926 паводле аповесці Міхася Чарота «Свінапас» Тарыч зняў фільм «Лясная быль». Падчас вайны ўзначаліў сфармаванае на тэрыторыі СССР «Манголкіно» і зняў адзін з першых мангольскіх фільмаў «Стэпавыя віцязі».

**Алесь Аркуш: Я — нонканфарміст, а не мазахіст.** 28 мая сваё 50-годдзе адзначыць паэт і рухавік літпрацэсу Алесь Аркуш. Яшчэ ў 1980-х, у пік адраджэнскага руху, ён з'ехаў са сталіцы ў Наваполацк. Перацягваў туды літаратурны працэс: заснаваў ТВЛ, прэмію «Гліняны Вялес», выдаваў альманахі «Ксеракс беларускі»і «Калоссе» разам з кніжнай серыяй. Гэты была ўнікальная па сваім культурніцкім плёне дзейнасць, якая зрабіла з Полацка і Наваполацка кіпучы цэнтр культуры. «Гліняны Вялес» — прэмія без грашовай узнагароды — стала прэстыжным адзначэннем, бо яшчэ ні разу не трапіла да графамана. У той жа час яе лаўрэатамі рабіліся амаль выключна незалежныя пісьменнікі.

**Лявон К; Сяргей Макарэвіч**



# Юры Туронак: І «Пагоня» вернецца, і мова таксама...

Семнаццаць гадоў таму кніга «Беларусь пад нямецкай акупацыяй» стала бестселерам. Яе аўтар Юры Туронак першым пачаў даследаваць самыя забароненыя саветамі моманты айчыннай гісторыі. Сёння ён справядліва лічыцца самым аўтарытэтным знаўцам Другой сусветнай вайны ў Беларусі.

## «У гісторыі існуюць дзве праўды»

**—Юры Браніслававіч, чаму вы ўзяліся за даследаванне самых нязручных тэм у гісторыі Беларусі, якія савецкая і нацыянальная гістарыяграфіі імкнуліся абмінаць?**

—Найбольш мяне натхнялі распрацоўкі савецкіх гісторыкаў ды публіцыстаў пра нямецкую акупацыю. Чытаць іх было страшна, бо тое была суцэльная няпраўда.

Я перажыў нямецкую акупацыю ў Вільні. Літва, як і частка Беларусі, уваходзіла ў райхскамісарыят «Остланд» і жыла паводле тых самых законаў. Мы сутыкаліся з цяжкасцямі ваеннага парадку. Аднак я скончыў пачатковую школу, вучыўся ў літоўскай гімназіі, дзе ніякай фашысцкай прапаганды мы не адчувалі. Пошта функцыянавала, людзі хадзілі ў кіно, тэатр. Адпаведна, я не верыў у тое, што савецкія даследнікі пісалі пра беларускіх дзеячаў. Заручыўшыся маральнай падтрымкай некаторых вашых прафесараў (напрыклад, Сцяпана Александровіча), вырашыў працаваць у гэтым кірунку. З часам я зразумеў, што ў гісторыі існуюць дзве праўды: палітычная і фактычная, якія вельмі часта не адпавядаюць адна адной.

Прыкладам гэтага ёсць «Катынская справа». У 1943 годзе немцы заявілі, што саветы вымардавалі пад Смаленскам тысячы польскіх ваеннапалонных. СССР у адказ звінаваціў немцаў. Слаўныя заходнія саюзнікі Сталіна – Вялікабрытанія і ЗША – таксама сцвярджалі, што гэта немцы. Адначасова афіцэры польскіх вайсковых фармацый на Захадзе атрымалі загад ад англійскага камандавання не гаварыць салдатам пра тое, што Катынь — работа саюзнікаў.

На Нюрнбергскім працэсе нямецкі міністр авіяцыі Герынг запярэчыў: «Вы закідаеце нам розныя паскудствы, але ж што вы зрабілі ў Катыні!»

Амерыканскі суддзя тады пазбавіў яго слова. Потым выявілася: у гэтым пытанні немцы мелі рацыю, што з часам пацвердзілі і савецкія, і расійскія ўлады. Аднак усё палягала ў тым, што фактычная праўда ў часе вайны пагражала расколам антыгітлераўскай кааліцыі.

Я ж хацеў дзяўбсці менавіта праўду фактычную, і вельмі многім гэта не падабалася. Ардэнаносныя дзеячы ў Беларусі незадаволена бурчэлі, аднак ад выхаду кнігі «Беларусь пад нямецкай акупацыяй» прайшло амаль 20 гадоў, яна пяць разоў перавыдавалася, але ніводнае сур'ёзнае абвяржэнне дагэтуль не з'явілася.

Гэтаксама не было абвяржэнняў адносна забойства Кубэ.

**—Нагадаю чытачам, паводле вашай версіі, забойства генеральнага камісара Генеральнай акругі «Беларусь» у верасні 1943-га было ажыццёўленае пры супрацы немцаў і саветаў. Усім нібыта кіравала нямецкая служба бяспекі (СД), выкарыстаўшы ў ролі выканаўцаў мясцовыя кадры. Наколькі я разумею, у вас на гэты конт цяпер сумневаў няма?**

—Ужо няма. Нядаўна я напісаў артыкул, заснаваны выключна на савецкіх дадзеных. Гэтак, з мэтай знішчыць Кубэ Масква стварыла і закінула на Беларусь каля 10 чэкісцкіх груп, якімі кіраваў былы наркам унутраных справаў БССР Цанава. Вынік іх дзейнасці быў нулявы. Затое гэта ўдалося групе, якая падпарадкоўвалася выведупраўленню Генштаба Чырвонай Арміі — Мазанік, Осіпавай і Траян. Самае цікавае, што пасля вайны часопіс «Работніца і сялянка» надрукаваў артыкул пра гераінь. Побач з іх здымкамі быў змешчаны пералік заслуг, але пра аперацыю па ліквідацыі Кубэ там не было ні слова. Увогуле, пятнаццаць гадоў пасля вайны Мазанік і К° афіцыйна не прызнаваліся забойцамі нямецкага генкамісара.

## «Галоўным імкненнем беларускіх палітыкаў была дзяржаўнасць»

**—Гаворачы пра апошнюю вайну, дзяржаўныя ідэолагі, як і колішнія савецкія, любяць згадваць пра калабарацыянізм нацыянальных дзеячаў. Дзе, з вашага гледзішча, праходзіць мяжа калабарацыі?**

—Калабарацыя — супрацоўніцтва з ворагам на шкоду свайму народу і дзяржаве. Асноўны кантынгент калабарантаў у Беларусі складалі паліцэйскія, якія надзявалі мундзір, атрымлівалі зброю і выконвалі загады немцаў. Беларуская справа ніякай карысці ад гэтага не мела.

Да калабарацыі адназначна належыць дыверсійная дзейнасць, якая не мела нічога агульнага з беларускімі інтарэсамі. Гэтак, Фабіян Акінчыц [лідэр беларускіх нацыянал-сацыялістаў] заахвочваў немцаў да выкарыстоўвання беларусаў у якасці агентаў Абверу. Беларускіх хлопцаў-дыверсантаў немцы скідалі на парашутах у БССР яшчэ да нападзення Гітлера на СССР.

Пра сялян і настаўнікаў, якія проста рабілі сваю справу, і гаварыць няма чаго. Якія яны калаборанты?! Галоўным жа імкненнем беларускіх палітыкаў была дзяржаўнасць Беларусі.

Дзеля дасягнення гэтай мэты яны гатовыя былі супрацоўнічаць з кожным, хто даваў на гэта надзею. Такімі былі Вацлаў Іваноўскі, Радаслаў Астроўскі.




**У Беларусі немцаў цікавіла перадусім эканамічная эксплуатацыя. Агітацыйны плакат часоў нямецкай акупацыі.**

## Вайна была грамадзянскай, а незалежнасць прыйшла з Масквы

**—Усё часцей даводзіцца чуць, што Другая сусветная вайна, якую за саветамі называлі выключна Вялікай Айчыннай, для беларусаў была ледзь не грамадзянскай. Наколькі справядлівае такое меркаванне?**

—Дзесяткі тысяч мужчын са зброяй у руках змагаліся адзін супраць аднаго: савецкія партызаны, пранямецкія беларускія фармаванні (Беларуская самаахова, Беларуская краёвая абарона, паліцыя)... Ужо гэтага даволі для сцверджання, што на Беларусі ішла грамадзянская вайна.

Прычым успрыманне гэтай вайны на захадзе і Усходзе краіны прыкметна розніласся. Гэтак, ва Усходняй Беларусі, якая дваццаць гадоў жыла ў СССР, людзі маглі лічыць сваім грамадзянскім абавязкам падтрымку савецкай улады. Нават калі яна была не заўжды справядлівай. Аднак у заходніх беларусаў ментальнасць была зусім іншая. Іх вызвалялі шмат разоў: немцы, саветы, палякі, зноў немцы. Гэтага было даволі, каб успрымаць нацыстоўскую акупацыю ўсяго толькі як чарговую змену. Да таго ж, яна давала магчымасць развіваць сваю культуру, мову, нацыянальную свядомасць, ствараць узброеныя сілы. Хоць апошняе ішло з вялікімі цяжкасцямі і не мела ўрэшце вынікаў.

**—Выступаючы на ўрачыстым сходзе напярэдадні 9 траўня, кіраўнік Беларусі чарговым разам заявіў, што для Беларусі «Вялікая Перамога – крыніца нацыянальнага гонару, аснова ідэалогіі і дзяржаўнасці». Васіль Быкаў лічыў, што «...здабыўшы перамогу, мы не здабылі свабоды»...**

—Я хачу вярнуцца да ацэнкі Кубэ, якую гадоў дзесяць таму даў беларускі гісторык Аляксей Літвін. Нягледзячы на тое, што за немцамі працавалі беларускія школы, былі спробы развіваць беларускую культуру і ствараць для беларусаў бацькаўшчыну, Літвін назваў кіраўніка Генеральнай акругі «Беларусь» «магільшчыкам беларускай дзяржаўнасці». Чаму? Бо ў адрозненне ад свайго ўкраінскага калегі Коха, які імкнуўся знішчыць украінскі нацыяналізм, Кубэ падтрымліваў беларускі...

## «Беларускі ўрад і войска за немцамі — міф»

**—А якія эпізоды што да падзеяў нямецкай акупацыі Беларусі для вас застаюцца цьмянымі?**

—Адным з такіх незразумелых фактаў ёсць стварэнне Беларускай цэнтральнай рады (БЦР) — галоўнай інстанцыі беларускай адміністрацыі ва ўмовах нацысцкай акупацыі. Рэч у тым, што Берлін не дазволіў ствараць падобную структуру ва Украіне і не даваў дазволу для Беларусі. Якім жа чынам гэта стала магчымым? Рэч у тым, што яшчэ Кубэ склікаў Беларускую раду даверу — дарадчы орган, які браў удзел у паседжаннях генеральнага камісарыята. Пасля смерці Кубэ ягоны наступнік фон Готберг пераўтварыў Раду даверу ў БЦР, на чале якой паставіў Радаслава Астроўскага. «Я не патрабую дазволу ў Берліна, бо маю Раду даверу, якую толькі актывізую. Яна павінная пашыраць у народзе антыбальшавіцкую прапаганду», — тлумачыў Готберг.

Такая самая аперацыя была праведзеная і з войскам. Готберг не мог стварыць беларускае войска, але мог склікаць падпарадкаваную яму 60-тысячную Баявую групу. У яе склад уваходзіла расійская дывізія Камінскага, татары, а рэшту кантынгенту аддалі пад Беларускую краёвую абарону (БКА). Астроўскі абвясціў мабілізацыю, на якую замест 10 запланаваных тысяч чалавек прыйшло 40 тысяч!

Немцы за галаву схапіліся і распусцілі палову ахвочых.

Беларускага войска не магло быць, бо існавалі ўсяго два ўзброеныя батальёны, уніформу для якіх стварылі ўжо на эміграцыі (трэба ж было нешта паказаць нашчадкам).

Затое дагэтуль застаецца феноменам стварэнне ў чэрвені 1943-га Саюза беларускай моладзі. На ўсёй акупаванай тэрыторыі былі яшчэ толькі дзве падобныя арганізацыі — у Латвіі і Эстоніі.

Палітычнае значэнне СБМ (сябрамі арганізацыі, па падліках Туронка, былі 10 тысяч беларускіх хлопцаў і дзяўчат — TUT.BY.) для Беларусі было велізарнае. Бо калі Латвія і Эстонія мелі перад гэтым 20 гадоў незалежнасці, то для Беларусі гэта было змаганне за развіццё і ўмацаванне нацыянальнай свядомасці маладога пакалення. Менавіта таму сяброў Саюза потым пераследавалі савецкія карныя органы, а прапагандысты называлі арганізацыю «беларускім гітлерюгендам», хоць СБМ ніколі не быў фашысцкай арганізацыяй.

**—Што да незалежнасці і самасвядомасці, вы сказалі вышэй, што «працэс ідзе, справа не скончана». Значыць, і беларуская нацыя не да канца сфармаваная?**

—Напэўна, так. Для таго каб завяршыць гэты працэс, патрэбен час і веды. Я тут гавару не пра хамскую, брутальную прапаганду ў духу беларускага тэлебачання, а пра нацыянальную адукацыю, якая дазволіць людзям разумець працэсы і праблемы.

Што чакае беларускую мову? У 1990-х улады Беларусі былі вымушаныя не фарсіраваць распаўсюд мовы. Асабліва ва ўсходніх раёнах, дзе расійшчына не была чужой і беларусізацыя магла ўспрымацца абсалютна адмоўна. З іншага боку, я кантактую багата з кім з Беларусі, і калі раней трэба было пагаджацца з расійшчынай, то цяпер усе гавораць па-беларуску. Беларускія студэнты, якія прыязджаюць вучыцца ў Польшчу, ведаюць беларускую мову...

Увогуле, з прагнозамі трэба быць асцярожнымі. Яшчэ летась усе пісалі пра «незваротны характар дрэйфу Украіны на Захад». Цяпер, калі прэзідэнтам выбралі Януковіча, сітуацыя перавярнулася з ног дагары.

Думаю, з часам можна будзе вырашыць справу і з беларускай мовай у Беларусі, і з нацыянальнай сімволікай, і са школьнымі падручнікамі. Лічу, што ўсё гэта прыйдзе.

Але ўлічваючы нядаўнюю гісторыю, гэта не можа быць адразу. Пакуль жа трэба карыстацца з таго, што ёсць, і пачынаць палітычнае, культурнае і дзяржаўнае адраджэнне з саміх сябе.

*Гутарыў Кастусь Лашкевіч, tut.by*



**Юры Туронак**

нарадзіўся 26 красавіка 1929 у Дукштах (сёння — Літва) у сям'і дзеяча заходнебеларускага руху. Скончыў Дукштанскую пачатковую школу (1942), вучыўся ў Віленскай гімназіі №1. З перадачай Беласточчыны ПНР апынуўся ў Польшчы (1945).

Скончыў Галоўную школу планавання і статыстыкі ў Варшаве (1952). Працаваў ў Польскай Замежнагандлёвай палаце, даследуючы кан'юнктуру міжнароднага хімічнага рынку, працаваў у Еўрапейскай эканамічнай камісіі ў Жэневе.

Гістарычнымі даследаваннямі займаецца з пачатку 1960–х. Доктар гісторыі (1986).

Аўтар кніг «Беларускае школьніцтва на Беласточчыне» (1976), «Беларусь пад нямецкай акупацыяй» (шэсць выданняў: 1993–2007), «Беларуская кніга ў Другой Рэчы Паспалітай» (2000), «Беларуская кніга пад нямецкім кантролем» (2002), «Вацлаў Іваноўскі і адраджэнне Беларусі» (1992, 2007), «Людзі СБМ» (2006), «Мадэрная гісторыя Беларусі» (2006). Жыве ў Варшаве.




# Казліная помста

**Таццяна Барысік.**
Апавяданне.

Уяві сабе, мой шаноўны дружа: табе тэлефануюць уночы. Здымаеш слухаўку і чуеш хрыпаты голас:

— Ты хацеў свежыны? Я зрабіў!

Якой будзе твая далейшая рэакцыя на гэткае нечаканае паведамленне? Напэўна, спалох, разгубленасць, злосць, запозненая цікаўнасць.

Вось і жыхар вёскі Забалаць Францусь, крывой акушэркі сын, мусіць, адчуваў нешта падобнае, калі яму а другой гадзіне ночы патэлефанаваў Грышка Бык з суседніх Забудзек, таму спачатку Францусь аслупянеў, пасля раззлаваўся, аблаяў свайго начнога суразмоўцу і на ўсялякі выпадак вырубіў тэлефон. Ведама, п'яны Грышка! Чалавек адзінокі, а пагаварыць любіць. Але сон не йшоў.

— А каб яго чэрці, паўдурка гэтага, успароў пасярод ночы, — бурчэла жонка Маня.

«Калі свежына не жарт і не белая гарачка, дык адкуль жа яна ўзялася? — навязлівае пытанне не давала спакою стамлёнай Францусевай галаве. — З гаспадаркі ж у Грышкі толькі конь ды рабы сабака. Значыць, свежыною мог стаць альбо нехта з ягоных жывёлінаў, або сябрукі прывалаклі на падворак скрадзеную быдлячыну».

Ды як паказала жыццё, нават у сваіх самых смелых прыдумках уявіць праўдзівае паходжанне свежыны не здолеў бы ані Францусь, крывой акушэркі сын, ані ты, мой шаноўны дружа.

Ну, няма ладу на белым свеце! Толькі Францусь з Маняю селі снедаць, у хату ўваліўся Грышка Бык. У адной руцэ ён валок торбу, у другой — валасатую нагу з капытом.

— Гэта ж пайшоў я ўночы па калгасныя кіяхі. А там ляжыць каза дзікая. Можа, камбайн падрэзаў. Ну, я яе віламі і дакалоў. Мяса пачаў варыць адразу, як дадому прыйшоў. Калі добра ўварылася, вам пазваніў, — пахуткаму расказаў Грышка, кінуў нагу з капытом на канапу, а мяшок на стол паставіў:

— Частуйцеся мяскам!

— Ну і напужаў ты нас ноччу! — абазваўся Францусь.

«Прынесла цябе халера ясная якраз сёння! Работы процьма, гарбузы з гарода ў варыўню паўносіць, бульбу дробную ў мяхі паперасыпаць. Што ж, цяперака не выганіш. Са сваім прыйшоў. Ды й конь у яго адзін на дзве вёскі. А нам хутка гарод пераворваць. Давядзецца паўлітру паставіць. Хай п'е, каб яму зарвала!» — разважала Маня, а ўслых толькі й паспела заўважыць:

— Чаго ты пацёгся ўночы па тыя кіяхі? Іх жа і ўдзень ніхто не пільнуе.

Грышка развязаў торбу з казляцінай — смурод паплыў па хаце.

— Кепска вымачыў, — Маня ўзяла патэльню і накіравалася да пліты. — То, мусіць, не каза, а казёл быў.

— Мо й казёл, — не стаў спрачацца Грышка, баючыся застацца без дармавой паўлітры.

— Нічога-нічога, дай болей спецаў, — параіў крывой акушэркі сын, згодны на любую закуску.

Узялі па чарцы. Францусь заўзята калупаў відэльцам мяса. Грышка павесялеў і завёў свой заўсёдны бясконцы аповед аб гісторыі свайго роду. Ніводная, нават самая дробная крыўда, нанесеная яму сваякамі ці аднавяскоўцамі за апошнія сорак гадоў, не была пакінутая па-за ўвагай. Ніхто з родных і блізкіх не заставаўся без мацюка або праклёна. З раднёю Грышку не пашанцавала — яе было зашмат. Мала таго, што меў трох родных і чацвярых зводных братоў і сясцёр, дык яшчэ й сам тройчы жаніўся, кожны раз няўдала. Сваяцкая кодла псавала брагу, крала гарбузы, хавала бацькоўскую ашчадкніжку, употайкі разбірала плот на дровы, выклікала міліцыю дый ці мала што яшчэ. Складалася ўражанне, нібы на Грышку несупыннаю вайною апошнія сорак гадоў ідзе ўвесь белы свет.

— Вось я чалавек парадачны. А мая сястра ў другой стрэчы Нінка? — пытаўся Грышка сам у сябе.

— А то мы не ведаем, хто ты і адкуль ты, — уступіла ў маўклівую спрэчку Маня.

— Мая сястра Нінка — гадасць з гадасці! Два гады таму ў госці прыязджала. Потым знюхалася з цюрэмшчыкам, кумам дачкі матчынай цёткі Алёны, каторая замужам за лесніком. Вось два бройлеры з двара і зніклі. Я мацеры так і сказаў: гэта толькі іхняя работа!

Яшчэ выпілі. Грышка еў бульбу як не ў сябе; балбатаў і балбатаў, прыпамінаючы ўсё новыя падрабязнасці пазалеташняга злачынства супраць бройлераў і чалавека, дый не збіраўся сыходзіць з гасцей.

«Колькі ты мне тут ачэртаць будзеш? Ох і гадзіла б я табе, каб не твой конь! Мабыць, сам разам са сваёй раднёй дуркаватаю прапіў тыя куры ці з'еў, не помніш ні халеры. І мой, бязмен дурны, плявузганне гэтае слухае, рот разявіўшы. Не ў галаве яму, што работы мора».

Захмялелы бязмен тым часам ласаваўся нясвежаю свежыною, адпіхваючы ўбок бульбу:

— Я абвяшчаю бульбе байкот, яна перасоленая!

— А я абвяшчаю байкот казлу! — страціўшы цярпенне, ляпнула дзвярыма Манька і накіравалася на свае соткі.

Ва ўяўленні паўстала страшэнная карціна: мароз наўкола, а з неба лятуць белыя мухі і падаюць на непарадчаныя гарбузы.

— Я чалавек парадачны... — несліся наўздагон ёй словы казлінага паляўнічага.

Ураджай радаваў вока. Кабачкі ды гарбузы ляжалі ў барознах гладзенькія, як укормленыя парасяткі. Пазносіла іх у варыўню, бульбу ў мяхі паперасыпала. Тупала б яшчэ, але, як ні пніся, усю работу не пераробіш. Замарылася, есці захацела. Абедаць позна, вячэраць шчэ рана. Не згледзела, як час прабег. Аўталаўка ўжо хутка. Праз вуліцу Маня шкрэбала са сваіх сотак дахаты.

На суседавай лаўцы ў чаканні аўталаўкі было як ніколі людна і весела. Паў-Забалаці сабралася: тры бабы і глухаваты дзед Васіль, ды яшчэ забудзькаўская дачніца прывалаклася. Ну як яе там, Адэля ці Алеся... Не, Аксеня, пыльным мехам пацопаная, па чужых дварах швэндаецца, языком малоціць, нібы дома работы нямашака.

Дзед Васіль уключыў транзістар на ўсю моц і цяпер цешыўся жыццём:

— Усе дзеўкі каля мяне! Я гарманіст!

Абмяркоўвалі тутэйшыя навіны. Адны і тыя ж, Маньцы даўно вядомыя. Галя ездзіла ў горад зубы ставіць. Старую Ахрэмчыху забрала «хуткая», урач паглядзеў і сказаў: «Мусіць, у яе нешта нехарошае». П'яны Віцька Сцёпішын згубіў пад лаўкаю кансервы і ліверную каўбасу.

І раптам:

— Ну, яна й кажа: «Бяры гэтую казу сабе. Мае Найда з Шарыкам маленькія, шчэ патруцяцца і здохнуць, а твой Тузік вялікі, з'есць тое мяса, халера яго не возьме...» — пачула Маня голас забудзькаўскай дачніцы Аксені.

Здагадка аж апякла ўсё ўсярэдзіне. Вобміг падскочыла да той дачніцы і пачала распытваць. Высветлілася наступнае. У Надзі, Грышкавай суседкі праз вуліцу, захварэлі козы. Адна прапала ўжо, другая ў хляве раніцою не падымалася. Па ўсім відаць, канала. То Надзя і папарасіла Грышку Быка зарэзаць казу, а мяса забраць свайму сабаку.

А божа мой, а мілы мой! Ды пайшоў ты, Грышка, гад такі, разам са сваім канём! А як праз таго клятага казла Францусь занядужае ці, не тут казана, перакуліцца? А ў гародзе сама работа, ды і чаравікаў няма, касцюма новага няма, пашпарт кудысь збаёдаў», — думкі, адна страшнейшая за другую, гналі Маню на падворак.

У хаце было ўсё па-ранейшаму. Баляванне працягвалася. Паўлітру спустошылі і ўзяліся за націрку для каленяў. Францусь злупіў патэльню мяса, ад з'едзенага і выпітага яго цягнула на сон. А Грышку і чэрці не бралі! З ваяўнічым запалам ён мацюкаў свякруху нейкай Ларысы. Тая нібыта ўгаварыла ці то дзедавага брата, ці то братавага дзеда перапісаць хату на яе ўнучку. Францусь спачатку спрабаваў зразумець, адкуль узялася Ларыса разам са свякрухаю і кім яны абедзве даводзяцца Грышку, але неўзабаве кінуў марную справу.

Грышка адсутнасцю слухача надта не засмучаўся, працягваў сваё плявузганне:

— Прыязджаю — а яны плот разабралі. Ах вы, кажу, падлы, з сіраты іздзяёцеся! Я чалавек парадачны. А Грунін Лявон...

— Ты прывалок сюды здохлага казла, а парадачныя людзі так не робяць! — уляцела з сенцаў раз'юшаная Манька. — Прэч з хаты, свіння п'яная!

Парадачны чалавек і ўласнік адзінага каня, убачыўшы шалёны бляск яе вачэй і матыку ў руках, чакаць сябе не прымусіў. Ускочыў — ды ходу.

Акушэркі крывой сын дрыхнуў за сталом, хроп як мядзведзь і паміраць відавочна не збіраўся.

— Я адна на гародзе кішкі рву, а ты п'еш, апудайла лянівае! — шкамутала раззлаваная Манька аматара халяўнай свежыны.

Ён сапраўды падняў галаву, хмель пачынаў крыху разыходзіцца. За акном стаяла цёплая восень, шапацелі яблынькі ў садзе, мяккае вечаровае святло сцялілася па масніцах. Свет здаваўся такім утульным. Францусю раптам захацелася сказаць жонцы нешта добрае, прымірэнчае:

— Казла з'елі — і ладна. Тае бяды, што смярдзючы.

Сцямнела. Праспаўся зБольшага і Грышка ў сваіх Забудзьках. Толькі не было яму спакою, не пайшла на карысць выпіўка з дарэмнаю закускай. Я сама, мой шаноўны дружа, не бачыла, але Аксеня з Надзяю, забудзькаўскія бабы, казалі, нібыта ўсю ночку па Грышкавым падворку блукала і нават зазірала ў вокны здань: прывід зарэзанай казы.

**Замест эпілога.**

А ўвогуле гэтая гісторыя скончылася не так пагана як пачыналася. Францусь, крывой акушэркі сын, жыхар вёскі Забалаць, жывы і здаровы. Манька памірылася з Грышкам. Што ж рабіць? Чалавека шкада, казла не вернеш, а гарод, мой шаноўны дружа, пераворваць усё адно трэба.



**Таццяна Барысік**
Пісьменніца. Жыве ў Магілёве. Працуе настаўніцай.

# Знакі прыпынку

**Уладзімір Някляеў.** Запісы

***

Бураўкін у каторы раз распавядае пра тое, як яны з Вярцінскім збіралі подпісы пад лістом у абарону Быкава. Але гэтым разам ва ўспамінах ягоных усплывае даволі цікавы эпізод з Іванам Навуменкам, маім суседам.

Навуменка ліст адразу не падпісаў, пабаяўся... Бураўкін жа з Вярцінскім пастанавілі завершыць збор подпісаў у нейкі там дзень (Бураўкін сам не памятае, у які) апоўначы. І ўсё, кропка. Хто падпісаў, той падпісаў. І раптам апоўначы тэлефануе Навуменка: «Генадзь, я перадумаў, хачу падпісаць». «Хацець ты, Іване, — адказвае Бураўкін, — можаш, але падпісаць — не. Раней трэба было падпісваць, калі мы табе гэта прапаноўвалі, а цяпер позна». І кладзе слухаўку, каб спаць.

Але тут тэлефануе Алесь Адамовіч: «Слухай, толькі што Навуменка са мной гаварыў, ты яму ліст падпісаць не даеш, дык няхай падпіша...» Бураўкін і яму адказвае, што позна, бо ёсць наконт гэтага дамоўленасць. І ёсць прынцыпы ўрэшце рэшт... Зноў кладзецца спаць, але яго падымае званок у дзверы: Адамовіч з Навуменкам. Адамовіч кажа: «Дай ты яму гэты ліст падпісаць, бо да раніцы тэрор будзе...»

Навуменка падпісаў і сказаў:

— Цяпер я магу жыць у згодзе з сумленнем.

Я перапытаў: «Так і сказаў?» — і Бураўкін кіўнуў: «Слова ў слова. Вось такі быў некалі Іван...»



***

Адзінае, што маем на зямлі — адведзены нам час. І ні з кім, і ні з чым не развітваемся мы гэтак лёгка, як з часам.

Сутнасць жыцця ў развітанні з ім.

***

Рэпутацыя, у тым ліку літаратурная, аднойчы сфармаваная, застаецца нязменнай. Нават калі той, чыя рэпутацыя маецца на ўвазе, змяняецца да непазнавальнасці, яго ўсё адно пазнаюць па рэпутацыі. Як бычка ў статку па кляйме.

***

Зачасціўшы апошнім часам па судовых пасяджэннях, паглядзеў я на аднаго суддзю (які Казуліна судзіў), на другога, на трэцяга... Можа быць, яны і думаюць пра сябе, што яны суддзі, але ніякія яны не суддзі. Бо суддзя — гэта найперш вольны чалавек, незалежны ў сваіх рашэннях ні ад каго і ні ад чаго, апроч закона. Гэтыя ж, якія, можа, думаюць, што яны суддзі, не вольныя людзі, а парабкі, халопы, і закон для іх — жаданне пана.

Ім нават не скажаш: «Некалі вам сорамна будзе дзецям сваім у вочы глядзець», бо ў іх вачах і не начаваў сорам. Гэтаксама як сумленне ў душы ці гонар у сэрцы.

Адно слова — смерды.




## КАНЦЭРТЫ

### Рок за Баброў

**5 чэрвеня а 15-й у Сілічах** — Рок за Баброў. Бяруць удзел **«Без білета»**, **«Градусы»** і **«Воплі Відоплясова»**. Уваход вольны.

### Паляна з «Ляпісамі» й Шнуром

**29 мая ў Сілічах** пройдзе рок-фестываль «Паляна», хэдлайнерамі якога будуць гурты **«Ляпіс Трубяцкой»** (Беларусь) і **«Рубль»** (Расія). «Рубль» — гэта гурт музыкі Сяргея Шнурава. Так што дзяцей лепей на канцэрт не браць — са сцэны могуць гучаць маты.

### «Тройца» ў КЗ «Мінск»

**30 мая а 19-й ў Малой зале КЗ «Мінск»** — канцэрт этна-трыо «Тройца» «Траецкая сустрэча». Гурт Івана Кірчука зноў гатовы правесці кожнага, хто жадае, у глыбіні народнай свядомасці. У дзень светлы, адмысловы, напоўнены радасцю высокага свята. Этна-трыо «Тройца» запрашае ўсіх на музычную сустрэчу, амаль хатнюю, дзе ўсім будзе камфортна…

### Сіні пашпарт

**5 чэрвеня ў клубе Mezzo Forte (ВДНГ, 1-я Астанкінская вул., 53, Масква)** пройдзе фэст «Сіні пашпарт». Першы вялізны канцэрт новага праекту Рамана Арлова (экс-J:Морс). **Пачатак а 20-й.**

### Madera Hard Blues

**29 траўня а 18-й у «Графіці» (зав.Калініна, 16)** — Madera Hard Blues.

### Нагуаль

**30 мая а 19-й у «Графіці»** — «Нагуаль».

### Разбітае сэрца пацана

**3 чэрвеня а 19-й у «Графіці»** — «Разбітае сэрца пацана»



### Віталь Стахіевіч

Піяніст Віталь Стахіевіч, лаўрэат міжнародных конкурсаў, магістр Амстэрдамскай кансерваторыі, **27 мая** дае канцэрт **у Мінску, Белдзяржфілармонія, Вялікая зала, а 19-й.** Праграма: Моцарт. Саната ля мінор. Бах-Бузоні. Чакона. Шапэн. Тры Накцюрны. Саната №2.

## ІМПРЭЗЫ

### Беларуская дыскатэка

**31 мая ў клубе «Рэактар» (вул.В.Харужай, 29) а 23-й** — беларуская дыскатэка.

### Didžioji Lietuva (Вялікая Літва)

**27 мая а 17-й Мастацкі музей** запрашае вас на прэзентацыю двух тамоў унікальнага выдання — фотаальбома Didžioji Lietuva (Вялікая Літва). (Спадчына ў Беларусі: замкі, маёнткі, малітоўныя дамы, гарадзішчы). У прэзентацыі бярэ ўдзел ансамбль старадаўняй музыкі і танца Banchetto musicale (Вільня).

### Вір

**28 мая а 19-й у Музеі імя Янкі Купалы ў Мінску** адбудзецца музычна-паэтычная вечарына «Вір» з удзелам праекту «Dzivasil». Вас чакае знаёмства з беларускімі этнічнымі інструментамі і старадаўнімі песнямі.

## ВЫСТАВЫ

### Партрэт Максіма Багдановіча

**Літаратурны музей Максіма Багдановіча (вул. М.Багдановіча, 7а)** у межах святкавання Міжнароднага дня музеяў прэзентуе выставу адной карціны — мастацкай работы Валянціна Волкава «Партрэт Максіма Багдановіча» (1927 год)! Гэта першы жывапісны партрэт паэта. Мастацкая работа экспануецца толькі **да 31 мая**.

### Грунвальд на палотнах

**У Гістарычным музеі (вул. Маркса, 12)** працуе мастацкая выстава «Вобразы мінуўшчыны», прысвечаная 600-годдзю Грунвальдскай бітвы. У экспазіцыі шырока прадстаўлены амаль усе мастацкія жанры: партрэт, краявід, батальны жанр. Пачэснае месца займае тут гістарычны партрэт. Гэта выявы князёў Альгерда, Кейстута, Вітаўта… Працы найлепшых беларускіх мастакоў!

### Ажаніцца — не журыцца

**У Музеі Максіма Багдановіча (вул.Багдановіча, 7а) да 30 чэрвеня** працуе мастацка-дакументальная выстава «Ажаніцца — не журыцца», прымеркаваная да 95-годдзя першай публікацыі вершаванай казкі Максіма Багдановіча «Мушка-зелянушка і камарык — насаты тварык». Выстава прысвечаная святу вяселля.

### Святло стагоддзяў

**У Музеі гісторыі беларускай літаратуры (вул. Багдановіча, 13)** экспануецца літаратурна-мастацкая выстава «Святло стагоддзяў», прымеркаваная да юбілейных дат асветнікаў зямлі беларускай — Кірылы Тураўскага, Міколы Гусоўскага, Францішка Скарыны, Сымона Буднага, Васіля Цяпінскага.

### Фотавыстава Лянкевіча ў Мінску

**28 мая ў Гётэ-інстытуце ў Мінску (Харужай, 25/3, 4 паверх)** адкрыецца фотавыстава Андрэя Лянкевіча «Патаемнае жыццё». **Пачатак а 15-й.**

## ТЭАТРЫ

### Тэатральны феерверк у Мінску

**Да 30 мая ў Мінску** ідзе Беларускі міжнародны фестываль тэатраў лялек. Свае самыя яркія пастаноўкі паказваюць тэатральныя калектывы з Бельгіі, Латвіі, Польшчы, Расіі, Славеніі, Украіны, Эстоніі і, канечне ж, Беларусі. Фестываль праходзіць **на чатырох пляцоўках Мінска: тэатра лялек, Купалаўскага тэатра, тэатра імя Горкага і «Новага тэатра».**

**26 мая**

**Тэатр імя Горкага** — «Пане Каханку»
**Купалаўскі тэатр** — «Сымон-музыка»
**Купалаўскі тэатр** (Малая сцэна) — «Старамодная камедыя»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Усё будзе класна! 65 кг. Гарохаў»

**Тэатр імя Горкага** — «Пане Каханку»
**Купалаўскі тэатр** — «Сымон-музыка»
**Купалаўскі тэатр** (Малая сцэна) — «Старамодная камедыя»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Усё будзе класна! 65 кг Гарохаў»

**27 мая**

**Купалаўскі тэатр** (Малая сцэна) — «Спячая прыгажуня» (Тэатр у чамадане, Эстонія). Пачатак аб 11-й і а 14-й.
**Тэатр лялек** — «Хітрая ліска і дурны воўк» (Латвійскі тэатр лялек). Пачатак аб 11-й і а 14-й.
**Купалаўскі тэатр** (Малая сцэна) — «Папялушка. Урыўкі з яе дзённіка» (Любляна). Пачатак а 19-й.
**Новы драматычны тэатр** — «Яўгеній Анегін» (Кемерава). Пачатак а 20-й
**Купалаўскі тэатр** — «Івона, прынцэса Бургундская»
**Тэатр імя Горкага** — «Анджэла і іншыя»
**Купалаўскі тэатр** — «Івона, прынцэса Бургундская»
**Тэатр імя Горкага** — «Анджэла і іншыя»

**28 мая**

**Тэатр лялек** — «Дзюймовачка» (Любляна). Пачатак аб 11-й
**Купалаўскі тэатр** — «Poison» (Магілёўскі абласны тэатр лялек). Пачатак аб 11-й і а 14-й.
**Купалаўскі тэатр** (Малая сцэна) — «Антыгона» (Палтаўскі тэатр лялек). Пачатак а 19-й.
**Тэатр лялек** — «Дон Жуан у Венецыі» (Архангельск, Расія). Пачатак а 20-й.
**Купалаўскі тэатр** — «Маэстра»
**Тэатр імя Горкага** — «Перад заходам сонца»
**Купалаўскі тэатр** — «Маэстра»
**Тэатр імя Горкага** — «Перад заходам сонца»

**29 мая**

**Купалаўскі тэатр** — «Чорная панна Нясвіжа»
**Тэатр імя Горкага** — «Распуснік»
**Тэатр лялек** — «Цвецік-сяміцвецік» (Беларускі тэатр «Лялька», Віцебск). Пачатак аб 11-й і а 14-й.
**Купалаўскі тэатр** (Малая сцэна) — «Антыгона» (Палтаўскі тэатр лялек). Пачатак а 18-й.
**Малая зала Палаца Рэспублікі** — «Жанчына-Крук» (тэатр «Агара», Бельгія). Пачатак а 19-й.
**Купалаўскі тэатр** — «Чорная панна Нясвіжа»
**Тэатр імя Горкага** — «Распуснік»

**30 мая**

**Купалаўскі тэатр** — «Translations»
**Купалаўскі тэатр** (Малая сцэна) — «Зіма»
**Тэатр імя Горкага** — «Утаймаванне наравістай»
**Тэатр лялек** — «Русалачка» (Брэсцкі тэатр лялек). Пачатак аб 11-й і а 14-й.
**Купалаўскі тэатр** — «Translations»
**Купалаўскі тэатр** (Малая сцэна) — «Зіма»
**Тэатр імя Горкага** — «Утаймаванне наравістай»

**31 мая**

**Купалаўскі тэатр** — «Translations»
**Купалаўскі тэатр** (Малая сцэна) — «Зіма»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Сталіца Эраўнд»

**1 чэрвеня**

**Тэатр юнага гледача** — «Шытая лялька Рэгедзі Эн»
**Купалаўскі тэатр** — «Не мой»
**Тэатр імя Горкага** — «Ідэальны муж»

**2 чэрвеня**

**Тэатр юнага гледача** — «Па зялёных гурбах акіяна»
**Купалаўскі тэатр** — «Не мой»

**3 чэрвеня**

**Тэатр юнага гледача** — «Дзюймовачка»
**Купалаўскі тэатр** — «Пінская шляхта»
**Тэатр оперы і балета** — «Хаваншчына»

**4 чэрвеня**

**Тэатр імя Горкага** — «Свабодны шлюб»
**Купалаўскі тэатр** — «Пінская шляхта»
**Тэатр оперы і балета** — «Бахчысарайскі фантан»

**5 чэрвеня**

**Тэатр імя Горкага** — «Уяўны хворы»

**6 чэрвеня**

**Тэатр імя Горкага** — «Сунічная паляна»
**Тэатр оперы і балета** — «Травіята»
**Купалаўскі тэатр** — «Translations»

## КІНО

### Шрэк назаўжды

**Shrek Forever After** (2010)

Мультфільм / Камедыя. ЗША. 93 хвіл. Рэж. Майк Мітчэл.




Пасля таго як зялёны волат выратаваў прынцэсу, ажаніўся і абзавёўся трайняшкамі, Шрэк стаў залішне хатнім. Каб вярнуць сваё людажэрскае моджа, Шрэк заключае дамову з Румпельштыльцхенам. Хаўрус з хітрым карлікам ідзе не так, як чакалася, з прычыны чаго Шрэку давядзецца даведацца, якім было б жыццё ў каралеўстве «Далёка-далёка», калі б яго ніколі не існавала…

Крызіс сярэдняга ўзросту даганяе не толькі людзей, але і казачных персанажаў мужчынскага полу. Зялёная мультпачвара Шрэк у канцы выразае асабістыя экзістэнцыйныя праблемы і прыходзіць да высновы, што найгалоўнейшае ў жыцці — сямейныя каштоўнасці.

**Kino.br.by**

### IFAB забараніў падманныя рухі перад пенальці.

Міжнародны камітэт футбольных асацыяцый (IFAB) — адзіны орган, які можа ўносіць змены ў правілы гульні, — забараніў падманныя рухі, якія гулец робіць непасрэдна перад адзінаццаціметровым ударам з мэтай заблытаць варатара.

«Пенальцісты» болей не змогуць спыняцца перад мячыкам, вытрымліваць паўзу для таго, каб паглядзець, у які бок кінецца вартаўнік варотаў. Фінты дазваляюцца толькі падчас разбегу.

У адваротным выпадку футбаліст рызыкуе атрымаць жоўтую картку за неспартовыя паводзіны, а пенальці давядзецца перабіць.

Правіла ўступае ў сілу 1 чэрвеня і, гэткім чынам, будзе дзейнічаць ужо на палях Паўднёвай Афрыкі ў часе чэмпіянату свету 2010 года.

Апроч гэтага, на сваім паседжанні IFAB зацвердзіў папраўку пра абавязкі чацвёртага арбітра, які дагэтуль усяго толькі сачыў за ходам заменаў.

Адгэтуль значэнне гэтага рэферы шматкроць узрасце. Ён мусіць дапамагаць галоўнаму суддзю кантраляваць ход матчу ў адпаведнасці з правіламі гульні, асаблівую ўвагу надаваць інцыдэнтам у штрафных пляцоўках.

«Сёння ён гэтаксама важны, як і тыя арбітры, што знаходзяцца на полі», — адцеміў генеральны сакратар IFAB Джэрам Вальке.

**Cz**

Адзінаццаціметровы ўдар з'явіўся ў 1891 годзе. Яго яшчэ называлі «ўдар смерці». Біць яго спярша можна было з любога пункта на адлегласці 12 ярдаў. Прыдумка належыць ірландцу Джону Пенальці. Пра Джона забылі, а слова «пенальці» ведае кожны.

# Фінціць няможна



**Ці дапаможа Аргенціне Ліянэль Мэсі, найлепшы футбаліст свету 2009 года, перамагчы на Чэмпіянаце свету па футболе? У 2006-м аргенцінцы саступілі немцам у чвэрцьфінале акурат па пенальці.**

**Сапраўдная беларуская кухня**

### Страва са шпінату або лебяды

800 г шпінату або лебяды, 1 лыжка мукі, соль, 1 лыжка масла, 1 шклянка булёну або малака, 1 чайная лыжка цукру.

Шпінат або лебяду перабраць, апаласнуць, ад вады, адціснуць або абтрэсці. Укінуць у кіпень. Некалькі разоў перавярнуць і гатаваць да мяккасці, потым перакласці ў халодную ваду, апаласнуць, адціснуць і перацерці цераз сіта. Распусціць лыжку масла, змяшаць з мукой, развесці булёнам або малаком і закіпяціць. Палажыць у гэтую вадкасць адвараныя шпінат або лебяду, перамяшаць, пасаліць і пасаладзіць, моцна нагрэць, але не кіпяціць, бо страва счарнее, і падаць з падсмажанымі ў масле грэнкамі, выпускнымі яйкамі, амлетам або падсмажанай цялячай пячонкай.

Для прыгатавання гэтай стравы можна таксама выкарыстаць маладую крапіву, салату, бацвінне радыскі, але ў гэтым выпадку разводзіць страву трэба не малаком, а толькі булёнам.

### Выпускныя яйкі

Выпускныя яйкі, якія яшчэ часам называюць пердуты, робяцца наступным чынам: у ваду ў невялікім рондалі дадаюць солі і воцату, невысока над рондалем акуратна разбіваюць яйкі і па адным упускаюць іх у кіпень. Калі бялок зацвярдзее так, што яйка можна будзе дастаць шумоўкай або дршляковай лыжкай, дастаць іх асцярожна па адным і пакласці ў талеркі, куды адразу ж пасля гэтага наліць суп. Яйкі раскладаюць непасрэдна па талерках, бо ў супніцы яны могуць падушыцца.

**З кнігі В. Завадскай «Літоўская кухарка», 1864 г.**

**Падрыхтавала НБ**

МОМАНТ

# Заквітнела дрэва гінкга ў Гомелі

Упершыню ў Гомельскім парку заквітнела мужчынскае дрэва гінкга. Калісьці самыя першыя дрэвы, якія лічацца рэліктавымі, былі пасаджаныя ў парку яго заснавальнікамі — князямі Паскевічамі.

У вайну дрэвы загінулі. Замест іх у 60-я высадзілі новыя. Прыкладна гадоў 10 таму заквітнела жаночае дрэва — маленькімі белымі кветкамі. Але ж мужчынскае дрэва было яшчэ «зусім юнаком», расказвае супрацоўніца парка Надзея Брагіна:

— Цяпер наш «юнак» стаў сапраўдным мужчынам. Упершыню мужчынскае дрэва гінкга цвіце ў 50 гадоў. Гінкга ўвогуле жыве доўга і позна пачынае радзіць. У Японіі, дзе гэтае дрэва надта шануюць, яго называюць яшчэ «дзедавым дрэвам». Бо толькі ўнукі пакаштуюць плады ад каліва, пасаджанага дзедам.



Костачка дрэва ядомая — саладзенькая. Вырастаюць такія абрыкосікі — яшчэ адна назва дрэва ў перакладзе з японскай мовы — срэбны абрыкос.

У Японіі костачку спажываюць разам з сакэ — каб не п'янець. А драўніна гінкга — унікальная, практычна не згарае.

Каб пабачыць квітненне гінкга, варта выбрацца ў Гомель.

**Ірына Асташкевіч, «Звязда»; СГ**

ПСІХАЛОГІЯ

## Мужчыны маняць часцей за жанчын

У сярэднім мужчына кажа няпраўду тройчы ў дзень, ці 1092 разы за год; жанчына — двойчы ў дзень, ці 728 разоў за год. Да такой высновы прыйшлі даследнікі з Навуковага музея ў Лондане. Часцей за ўсё людзі хлусяць сваім маці (25% мужчын і 20% жанчын), піша The Daily Telegraph.

Мужчыны часта хлусяць, калі, напрыклад, кажуць: «Усё звычайна. Я ў парадку», «Прабач, я не чуў твайго званка», «Я стаю ў заторы», «Ты схуднела», «Гэта тое, што я заўсёды хацеў». Да фраз, якія жанчыны часта прамаўляюць няшчыра, адносяцца: «Я не ведаю, дзе гэта. Я гэтага не брала», «У мяне баліць галава», «Я купіла гэта на распродажы», «Не, я не выкідала гэтага».

Ці пакутуе чалавек, калі мусіць хлусіць? 82% апытаных жанчын — так, а сярод мужчын перажываюць толькі 70% паддоследных.

Каля 75% рэспандэнтаў лічаць, што хлусня дапушчальная дзеля таго, каб аберагчы пачуцці таго, каму маніць.

**СГ**

ПАДАРОЖЖЫ

## «Белавія» пачашчае палёты ў Пецярбург

Нацыянальная авіякампанія «Белавія» з 17 чэрвеня павялічыць частату палётаў па маршруце Мінск—Санкт-Пецярбург да пяці разоў на тыдзень.

Дадаткова да панядзелка, серады, пятніцы і нядзелі будзе рэйс яшчэ і ў чацвер. У Піцер з Мінска лётае самалёт канадскай вытворчасці CRJ-100/200, бізнес і эканом-класы. Час палёту складае 90 хвілін.

Кошт пералёту ў адзін бок — ад 90 еўра, пры падарожжы «туды-назад» тарыф складзе ад 145 еўра (аэрапартавыя зборы бяруцца дадаткова).

**БЕЛТА**

ХАРЧАВАННЕ

## Майк Тайсан стаў веганам

Скандальны баксёр Майк Тайсан заявіў, што здолеў цалкам адмовіцца ад жывёльных прадуктаў і перайсці на суровую веганскую дыету. Веганы не ядуць ніякіх прадуктаў жывёльнага паходжання.

Веганства яшчэ называюць строгім вегетарыянствам.

Летась «Жалезны Майк» перажыў страшную асабістую трагедыю, калі ў выніку няшчаснага выпадку загінула яго чатырохгадовая дачка Эксодэс.

**КаМ**

### Усе школьныя ранцы і заплечнікі будуць свяціцца

Новыя гігіенічныя патрабаванні да вучнёўскіх ранцаў, заплечнікаў і партфеляў увводзяцца з 1 чэрвеня.

Для вырабаў, разлічаных на вучняў пачатковых класаў, устаноўленае наступнае абмежаванне: іх вага павінная быць не большая за 600—700 грамаў.

А заплечнік ці партфель, разлічаны на навучэнцаў сярэдніх і старшых класаў, павінен важыць не больш як кілаграм.

На сумках і заплечніках абавязкова павінныя прысутнічаць светлоадбівальныя элементы (тасьма, стужка, накладкі ці ўстаўкі) — на пярэдніх, бакавых паверхнях і верхнім клапане.

**«Звязда»**

# Кемікі



1) Па якой дарозе чалавек не можа ісці не кульгаючы?

2) Хто на сабе хату носіць?

3) Калі дзяўчынка ў кожны вазон пасадзіць па кветцы, то ў яе застанецца адна кветка. Калі ж яна пасадзіць па дзве кветкі, то пустым будзе 1 вазон. Колькі кветак трэба пасадзіць і колькі вазонаў было ў дзяўчынкі?

**Сабрала Валянціна Карнялюк**

**Адказы на старонцы 16.**

**Прыватныя абвесткі**

**КНІГІ**

**Прадам** 4–томнік Васіля Быкава, 1982 года выпуску. Т.: (029) 776–35–57

**Тэрмінова набуду** 1 том кнігі «Я.Купала. Поўны збор твораў. У 9–ці тамах, 1995». faberrashed@gmail.com ці (029) 359–23–90

**ШУКАЮ ПРАЦУ**

**Гісторык, культуролаг** шукае працу ў Мінску (32 гады, валодаю кампутарам). Міхась. Т.: (025) 697–81–91, (029) 392–39–00. E–mail: lebiedz@tut.by

**КАЦЯНЯТЫ**

**Кацяняты, прыгожыя, ласкавыя.** Аддам у добрыя рукі. Т.: (017) 271–94–60, (029) 654–19–25

**СЯБРОЎСКАЕ ПАДАРОЖЖА**

**У паўднёвае Панямонне 30 мая** па маршруце: Мінск—Новая Мыш—Моўчадзь—Дварэц—Раготна—Рандзілоўшчына—Вензавец—Дзятлава—Мінск. Кантакты: (029) 111–73–32, (017) 262–73–43

**ЗДАМ КВАТЭРУ**

**Здам двухпакаёвую** кватэру ў Мінску. Т. (029) 757–94–07

**СПАЧУВАННІ**

**Памёр Міхась Барысевіч,** апошні выкладчык фізкультуры «легальнага» Беларускага ліцэя, які ў 2003 годзе разам з ліцэем сышоў «у падполле». Майстар спорту па ваенным мнагаборстве, спадар Міхась быў цудоўным чалавекам, сапраўдным беларусам (паходзіў з Лідчыны), адказным і сур'ёзным выкладчыкам. Мы яго не забудзем.

**У вёсцы Сяргеевічы Кіраўскага раёна развіталіся з Алесем Іванавічам Салановічам.** На пахаванне Алеся Іванавіча прыехалі сябры і таварышы з Бабруйска. Былы работнік «Белшыны», слесар, майстар на ўсе рукі Алесь Салановіч памёр 16 траўня. Памёр раптоўна, не дажыўшы колькі месяцаў да свайго 70–годдзя (юбілей ён адзначыў бы 15 кастрычніка). Жыхар Бабруйска, ён з наступленнем вясны выязджаў на малую радзіму. Сёлета ён вярнуўся на зямлю бацькоў назаўсёды. Няхай мяккім пухам будзе табе бацькоўская зямля, дарагі наш таварыш! Анатоль Сідарэвіч

**Спачуванні Паўлу Данэйку** ў сувязі са смерцю бацькі. Гэта цяжкія дні, мы ў сэрцах з табою. Сябры

**Прыватныя абвесткі ў «НН»** (не больш за 15 словаў) можна падаць бясплатна. Дасылайце поштай (а/с 537, 220050, Мінск) ці праз e-mail (nn@nn.by) або размяшчайце на форуме сайта www.nn.by. Дык скарыстайцеся!




**Штогод з каштанаў ля Адміністрацыі прэзідэнта абразаюць кветкі. Для гэтага падганяюць спецыяльны кран. Можа, яны падрыўныя? Не, «для падтрымання чысціні», кажуць у прэс-службе Адміністрацыі. Фота даслаў чытач.**




**Такія абсурдныя плакаты-папярэджанні вісяць у медыцынскіх установах Беларусі. У краіне шахідак ніколі не было, і з тэрарызмам праблем няма. Аўтары ідэі жывуць рэаліямі Расіі, але грошы марнуюць нашы з вамі, беларускія. Плакаты развешвае Грамадзянская абарона Беларусі. Фота даслаў чытач.**




**БАТЭ стала ўладальнікам кубку Беларусі. У фінале барысаўская каманда перамагла жодзінскае «Тарпеда» 5:0.**



**У Мадрыдзе падчас карыды матадор паслізнуўся. Бык выкарыстаў свой шанец і прабіў яму горла рогам. Стан матадора крытычны, ён у рэанімацыі.**

## УДАКЛАДНЕННІ

У №18 (663) ад 12 траўня слушны адказ на 2-е пытанне «Кемікаў» — 4 слупы. Той самы нумар, старонка 16. «Рэспубліка» па-англельску будзе, вядома, Republic. Перапрашаем за памылкі.

## Анекдоты



***

— Хлопцы, а я — на рыбу!

— Зайдзі на Еўрабачанне, там беларускім рыбакам шанцуе.

***

— Люблю сваю бабулю! Для яе я заўжды худая!

***

Абвестка ў царкве: «Калі ласка, не пакідайце без нагляду свае рэчы, каб хто-небудзь не падумаў, што гэта адказ на яго малітвы».

***

Весела быць патрыётам, седзячы на газавай трубе, і сумна быць патрыётам, седзячы на каналізацыйнай.

***

Вясковая настаўніца ніяк не можа вырашыць, за каго пайсці замуж, — за дырэктара школы ці за трактарыста. З аднаго боку, хуткі кар'ерны рост, з іншага — без трактара да школы не дабярэшся...

***

Паводле фэн-шуй, найлепшае месца ў доме для захоўвання скрадзенага — побач з торбай сухароў.

***

— Як прывабіць у сад птушак, каб яны знішчылі шкодных насякомых?

— Паспрабуйце паставіць пад дрэва памытую машыну.

## «НН» сто гадоў з вамі

**21 красавіка стары Кіеў распрашчаўся з мошчамі (рэліквіямі) святой Еўфрасініі,** і цяпер з харугвамі і тысячнымі грамадамі народу набліжаецца дачка князёў беларускіх у свой родны сталічны Полацк.

**«НН». №20. 1910**

**У працэсе зносінаў са следчай Святланай Байковай, якая вядзе справу Захаранкі,** сябры грамадскай камісіі па расследаванні ўпэўніліся, што следства не жадае браць пад увагу палітычную версію, робячы ўпор на варыянт выкрадання генерала за нейкія пазыкі ў крымінальнікаў. Святлана Байкова заявіла, што пра лёс Юрыя Захаранкі не ведае нічога, а справа па 100-м артыкуле хутчэй за ўсё будзе «прыпыненая». Такі вынік пасля года-паўтарох пошукаў — «звычайная практыка».

**«НН». № 20. 2000**

**Адказы да старонкі 15:**

1) Па лесвіцы. 2) Слімак. 3) 4 кветкі і 3 вазоны.

Адказы на кемікі са старонкі 15:

Наша Ніва
незалежная газета

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі Наста Бакшанская
шэф-рэдактар Андрэй Дынько
галоўны рэдактар Андрэй Генадзевіч Скурко
заснавальнік Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»
выдавец Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Мінск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА.** Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/0494179 ад 03.04.2009. Пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных абвестак. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №248 ад 22 чэрвеня 2009 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Мінск, вул. Асаналіева, 15–128. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Мінск, код 764.

**Наклад 6350.** **Газета выдаецца 48 разоў на год.**
Нумар падпісаны ў друк 23.00 25.05.2010.
Замова № 2530.
Рэдакцыйны адрас: Асаналіева 15–128.
Цана дамоўная.
ISSN 1819-1614
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
9771819161008 10020